№ 39 (684) 20 кастрычніка 2010

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Беларусь стане чайна-таўнам?**

Старонка 4



**У Мінску злавілі маньяка-педафіла**

Старонка 6



**Гісторыя: консул БНР у Маскве**

Старонка 12

## У НУМАРЫ

**У жонкі Лужкова адабралі мінскі раён «Ржавец»**

«Кітайскія інвестары пабудуюць у Мінску раён «Лебядзіны». **Старонка 4.**

**Бабруйскае КДБ закідалі «кактэйлем Молатава»**

Магчыма, анархісты. **Старонка 2.**

**Беларускі інтэрнэт набірае хуткасць, але не таннее**

Цэны найвышэйшыя, а хуткасць наймéншая сярод усіх суседзяў! **Старонка 15.**

**З'явіцца беларускі легкавік?**

Вытворца «Самандаў» прапануе выбраць для яго назву. **Старонка 13.**

**Неюбілейныя нататкі ў гонар школьнага юбілею**

15 кастрычніка адзначыў 75-годдзе Рэспубліканскі музычны каледж пры Беларускай акадэміі музыкі. Піша Юлія Андрэева. **Старонка 11.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Як фальсіфікуюцца выбары

Сенсацыйныя сведчанні падпалкоўніка міліцыі Мікалая Казлова. **Старонка 8.**



ЗМІЦЕР ПАНКАВЕЦ

## Выбар-2010

• **Мілінкевіч:** «Я адмаўляю ідэю, што любы пасля Лукашэнкі будзе лепшы за яго».

• **Дэпутат-лукашэнкавец: Быць Беларусі ўсходам Еўропы ці захадам Азіі?** Уладзімір Здановіч: Еўрапейскія каштоўнасці пагражаюць нашым нацыянальным каранням.
**Старонка 7.**

• **Апазіцыя гатова начаваць каля ўчасткаў.** 250 участкаў маюць ахапіць кругласутачным назіраннем.

• **Лазавік пра сведчанні падпалкоўніка Казлова:** «Не чытаў, не ведаю». І развітаўся.
**Старонка 8.**

• **Ці стане Міхалевіч новым Гайдукевічам?** Ён прапануе змену курсу без ломкі сістэмы.

• **Казулін:** Знішча ўсім апазіцыянерам было б моцным рашэннем.

• **Трыццаць сцягоў на праспекце.** Кандыдат ад БНФ правёў мега-пікет «Праспект нацыянальнага сцяга».

• **У цэнтры Мінска паўсталі палаткі.** Апазіцыя скарыстоўвае адлігу для агітацыі.

• **Прэтэндэнт у прэзідэнты Рыжкоў:** Скажам Лукашэнку «Дзякуй».

• **Кандыдат Праўальскі сабраў 60 тысяч подпісаў на Віцебшчыне.** Своеасаблівы рэкорд выбарчай кампаніі.
**Старонка 9.**

# Альтэрнатыва сусветнаму імперыялізму

### Чавес абяцае Беларусі нафты на 200 гадоў.

Апошнія пяць гадоў прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес нязменна наведвае свайго беларускага сябра Аляксандра Лукашэнку. Хоць на дзень ды заедзе. Як так супала, што настолькі падобныя кіраўнікі з'явіліся на розных полюсах свету?

Як заўсёды, абодва прэзідэнты проста ззялі ад сустрэчы адзін з адным. Яны не стрымліваліся ў кампліментах і абдымках. Было падобна, што сустрэліся старыя сябры, якія не бачыліся многа гадоў.

Зрэшты, на гэты раз назваць прыезд Чавеса проста рытуальным не выпадае. Быў заключаны вельмі важны кантракт паміж «Беларускай нафтавай кампаніяй» і «Петролеас дэ Венесуэла». Паводле гэтага пагаднення, Беларусь на працягу трох гадоў атрымае 30 мільёнаў тонаў нафты, то бок па 10 мільёнаў на год. Гэта палова максімальнай патрэбы краіны ў нафце і амаль удвая болей, чым гадавы аб'ём нафты на ўнутрыбеларускія патрэбы.

Летась Беларусь закупляла ў Расіі 21,5 мільёна. Тады яшчэ дзейнічалі льготныя мыты на энерганосьбіты. Сёлета ж Расія згаджаецца даваць нашай краіне толькі 6 мільёнаў бязмытнага паліва. Астатняе — па рынкавых цэнах. Пакрыўджаны Лукашэнка паляцеў у Каракас, каб там дамаўляцца з Чавесам. Тая паездка суправаджалася няспыннымі заявамі кіраўніка дзяржавы аб неабходнасці ўмацавання энерганезалежнасці краіны.

Дамовіцца па нафце ўдалося. Яна праз Атлантычны акіян, а потым — украінскія і прыбалтыйскія парты паплыла ў Беларусь.

Такое развіццё падзей выклікала іранічную ўсмешку ў расійскіх СМІ. Маўляў, купляць у Венесуэле нашмат даражэй, усё адно давядзецца вярнуцца да расійскага пастаўшчыка. Аднак пасля невялікага вывучэння сітуацыі стала зразумела, што лацінаамерыканскае паліва каштуе не нашмат больш. Справа ў тым, што расійская нафта цяжэйшая ў параўнанні з венесуэльскай. З лёгкай нафты атрымліваецца больш бензіну, а вось з цяжкай — мазуты.

Такім чынам, ідэя з пастаўкай нафты з далёкай Венесуэлы аказалася не такой абсурднай. Праўда, беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы былі «заточаныя» якраз пад расійскую нафту. Але вырашыць гэтыя тэхнічныя праблемы ўсё ж можна.

«Мець магчымасць прывезці нафту ў цэнтр Еўропы — гэта для нас вельмі стратэгічна. Мы ганарымся, што нашы караблі могуць пастаўляць нафту і праз Чорнае мора, і праз Балтыйскае, — сказаў Уга Чавес. — Беларускім нафтаперапрацоўчым заводам хопіць нафты на працягу двухсот гадоў», — не сунімаўся ён.

Ягоны беларускі аміга не адставаў: «Мы вітаем цябе на тваёй зямлі. Дзякуй за нафту, пастаўкі і за сонца, якое ты прывёз з Венесуэлы». «Не хачу быць тваім даўжніком не толькі ў матэрыяльным сэнсе. Я табе клянуся, што мы для Венесуэлы зробім столькі, што ты ніколі не пашкадуеш, што з намі звязаўся», — заявіў Лукашэнка.

«Тут няма даўжнікоў, мы — таварышы. Мы сумесна будуем альтэрнатыву сусветнаму імперыялізму», — супакоіў гаспадара Чавес. Лукашэнка на публіцы тэмы імперыялізму не падхапіў.

Скончыў свой візіт Чавес катаннем на трактары на пляцоўцы ля Нацыянальнай бібліятэкі. Відовішча было феерычным.

**Працяг на старонцы 3.**

# Бабруйскае КДБ закідалі бутэлькамі з «кактэйлем Молатава»

Адказнасць узялі на сябе анархісты.

Факт нападу на будынак аддзела КДБ у Бабруйску 16 кастрычніка пацвердзілі ва Управе ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама. Распачатая крымінальная справа па артыкуле «Хуліганства».

Сярод версій адпрацоўваецца і магчымая датычнасць нападнікаў да атакі на расійскае пасольства ў Мінску 30 жніўня гэтага года. Паводле папярэдняй інфармацыі, у суботу ўвечары невядомыя кінулі ў будынак Камітэта дзве пляшкі з запальнай сумессю. У выніку атакі ніхто не пацярпеў. У бабруйскім КДБ інцыдэнт не каментуюць.

Сайт belarus.indymedia.org паведаміў, што адказнасць за напад на сябе ўзялі актывісты анархісцкага руху ў знак падтрымкі мінскіх калег, арыштаваных па падазрэнні ў нападзе на пасольства РФ.

Лідар незалежнага грамадства Бабруйска Алесь Чыгір пра суботняе здарэнне даведаўся ад сябра ў ноч на нядзелю. «Ён патэлефанаваў і папярэдзіў, што да яго па гэтай справе прыходзілі з КДБ. Прасіў трымацца з ім сувязь». Па словах А.Чыгіра, ужо на наступны дзень камітэцкую сцяну перафарбавалі. «Сярод нас нават узніклі падазрэнні. А ці быў той інцыдэнт?»

Журналіст Дзмітрый Растаеў кажа, што ў Бабруйску напад вялікага розгаласу не атрымаў. У горадзе, па словах Растаева, пра напад на КДБ амаль не гавораць. «Хто ў інтэрнэт не заходзіць, той і не ведае». Журналіст мяркуе, што наўрад ці за нападам стаяць спецслужбы — у горадзе няма для гэта адпаведных перадумоваў. «Найхутчэй гэтак пра сябе захацеў заявіць хтосьці з мясцовых маладых анархістаў», — лічыць Дзмітрый Растаеў. Ён нагадвае пра паведамленне на сайце анархістаў пра тое, што «акцыя была хуткацечнай і імклівай», а відэа не ўдалося ў сувязі з нявопытнасцю аператара.

Тое паведамленне выклікала скептычную рэакцыю інтэрнаўтаў: «Ізноў «прыгожыя анархісты» абвясцілі вайну «сістэме» без удзелу народных масаў... Замест таго, каб знаходзіць сувязі з рабочымі, дапамагаць *ім* дамагацца таго, што трэба ІМ, весці агітацыю — вы аб'яўляеце вайну тым, супраць каго вы *пакуль абсалютна не гатовыя* выйсці».

Нагадаем, што 30 жніўня невядомыя кінулі на тэрыторыю пасольства Расеі ў Мінску бутэльку з запальнай сумессю. У выніку было пашкоджанае аўто дыпламатычнага прадстаўніцтва. Адказнасць за напад узяла на сябе раней невядомая анархісцкая групоўка «Сябры свабоды». Пасля інцыдэнту адбыліся масавыя затрыманні па падазрэнні ў здзяйсненні нападу актывістаў анархісцкага і экалагічнага руху.

6 верасня невядомыя закідалі «кактэйлямі Молатава» будынак СІЗА на Акрэсціна.

Тым часам у СІЗА-1 г. Мінска больш за месяц утрымліваецца Мікалай Дзядок, студэнт Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта. Яму было прад'яўлена абвінавачванне па артыкуле 339 ч.2 — хуліганства. Мікалая абвінавачвалі ў нападзе на расійскае пасольства, Дом прафсаюзаў і аддзяленне «Беларусбанка». А таксама ва ўдзеле ў несанкцыянаванай акцыі ля Генштаба Беларусі.

**Сямён Печанко**



**Каралі і капуста.**

### Самае чытанае на nn.by за 13—19 кастрычніка

- Сенсацыйныя сведчанні падпалкоўніка міліцыі: так фальсіфікуюць выбары
- Міхалевіч не збіраецца вяртаць сцяг і герб
- Як зарабіць на ўласны маёнтак
- Мілінкевіч: «Я адмаўляю ідэю, што любы пасля Лукашэнкі будзе лепшы за яго»
- Някляеў накарміў апанентаў
- Бел–чырвона–белыя сцягі на гадзіну апанавалі праспект
- Нарышкін: Аднаўленне адносінаў з Лукашэнкам магчымае
- Іван Шыла: Добра, што кампаніяй займаюцца маладыя
- Зянон Пазняк: «Настальгія — страшэнная з'ява. Гэта невыносна!»
- Лукашэнка збаяўся тэледэбатаў ужывую

### nn@nn.by

**У 1987 годзе я быў ліквідатарам на ЧАЭС.** Атрыманыя балячкі так і не праходзяць. Групы інваліднасці меў усе: ад першай да трэцяй. Але работнікі і мясцовай Пружанскай, і Брэсцкай абласной МРЭК так дапяклі, што прыйшлося ў свой час пісьмова адмовіцца ад трэцяй групы. Так і не дабіўся, каб маё захворванне залічылі атрыманым у Чарнобылі. На сёння з'ядаю лекаў на 282 000 рублёў штомесяц. Добра, што хоць іх пакуль выдаюць бясплатна... Нездарма ў нашай краіне інвалідаў мала. Для таго, каб хварэць, трэба мець моцнае здароўе.

**Мікола Руцкі, yandex.by**

**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб'ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскае відэа і фота. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА–версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.

### Сцісла

**• Прэзідэнтка Літвы Даля Грыбаўскайце наведае Мінск.** Яна прыязджае з афіцыйным візітам у сераду, 20 кастрычніка. Мяркуецца, што па выніках перамоваў будзе падпісаны шэраг двухбаковых дакументаў. Гэты візіт можна разглядаць як знак салідарнасці з Беларуссю ў яе канфлікце з Расіяй. Адначасова візіт успрымаецца як падтрымка Аляксандра Лукашэнкі перад прэзідэнцкімі выбарамі, на якіх выклік яму кідаюць некаторыя прарасійскія кандыдаты.

**• Партызаны атакавалі чачэнскі парламент.** Аўтамабіль як мінімум з трыма тэрарыстамі заехаў у двор парламента ўслед за машынамі дэпутатаў. Баевікам удалося пранікнуць у будынак. Але яны не здолелі захапіць спікера прамаскоўскага парламента Чачні. Ахова эвакуявала яго з будынка. У выніку нападу прынамсі шэсць чачэнскіх міліцыянтаў загінула. Загінулі і ўсе баевікі. Аперацыяй па вызваленні будынка кіраваў асабіста Рамзан Кадыраў.

**• Мінск трапіў у Топ-50 самых дарагіх гарадоў свету.** Ён аказаўся на 41-м месцы па цане офіснай нерухомасці. Дадзены рэйтынг склала кансалтынгавая кампанія Colliers International. Максімальныя стаўкі на офісныя памяшканні ў Мінску ў чэрвені дасягалі 42,2 даляра за квадратны метр у месяц. Беларуская сталіца абагнала Мюнхен, Дубаі, Лос Анджэлес, але адстала ад Кіева (44,6 даляра за метр). На першым месцы Ганконг са стаўкай 161,42 даляра.

**• Міхалок запісаў песню «Стоп, мафія!».** Ён заспяваў яе з культавым малдаўскім гуртам Zdob si Zdub. Музыкі спяваюць аб грошах, якія «зробяць цябе рабом», і высмейваюць мафіёзі. Песня ўвайшла ў альбом Zdob si Zdub «Белае віно / Чырвонае віно».

**• Выратаваныя чылійскія шахцёры гатовыя размаўляць толькі за $25—40 тысяч ганарару.** Раней, яшчэ знаходзячыся ў шахце, гарнякі дамовіліся падзяліць усе грошы, якія яны атрымаюць за інтэрв'ю, пароўну. Праўда, цяпер між імі распачаліся спрэчкі. Не ўсе згодныя з гэтым прынцыпам. І толькі адзін выратаваны гарняк Марыё Сепульведа даў інтэрв'ю бясплатна, матывуючы гэта тым, што журналісты паставіліся да яго сям'і з дабрынёй і павагай.

**• Найбліжэйшым часам — холад і дажджы.** Уначы і раніцай у асобных раёнах туман, слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы 0 — плюс 5°С, па паўночнай палове мінус 1—5°С, днём ад плюс 4°С на поўначы да плюс 11°С на поўдні.

**МБ**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazu дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Адрз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам,

якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Алесю Б., Аляксандру К., Уладзіміру Г. з Баранавіцкага раёна.
Аркадзю М., Віктару А., Валянціну М., Алене Б., Алене П. з Гомеля.
Сяргею Ц. з Докшыцкага раёна.
Уладзіславу І. з Віцебска.
Міхаілу т. са Слуцкага раёна.
Анатолю П. з Салігорскага раёна.
Івану З., Людміле П. з Пружанскага раёна.
В.М. з Лепельскага раёна.
Т.К., Сяргею К. са Смалявіцкага раёна.
Льву М. з Магілёва.

# Альтэрнатыва сусветнаму імперыялізму

На наступны дзень Чавес паляцеў у Кіеў. Ці не цэнтральным пытаннем абмеркавання стаў транзіт венесуэльскай нафты ў Беларусь.

Украінскі палітолаг Аляксандр Палій мяркуе, што ў транзіце зацікаўленыя беларусы і венесуэльцы. «Пытанне ў тым, ці зможа на гэтым этапе ўкраінскае кіраўніцтва весці сябе як суверэнны, надзейны партнёр і не прагінацца пад Расію. Для таго, каб гэта высветліць, відавочна, і прыязджаў Чавес», — лічыць А.Палій.

Гаворка ў Кіеве ішла таксама пра пастаўкі зброі Венесуэле. З Украіны венесуэльскі папуліст паляцеў у Іран.

Між іншым, пасольства Венесуэлы ў Кіеве ўсё яшчэ няма. У Мінску ж яно актыўна дзейнічае.

Надзвычай важна, каб венесуэльская нафта пацякла па трубаправодзе Адэса—Броды. Гэта на парадак зменшае яе сабекошт, проці даражэйшае перавозкі чыгункай. Нейкія папярэднія дамовы ў гэтым пытанні ёсць, але да канкрэтыкі яшчэ не дайшло. Сёлета ў лістападзе запланаваная пробная прапампоўка нафты ў Мазыр. Для гэтага вызваляць адну з галін трубаправода «Дружба». Да студзеня Беларусь мае намер адмовіцца ад паставак нафты чыгункай.

Крэмль пазірае на ўсё гэта з доляй раздражнення, бо паўднёваамерыканская краіна ўваходзіць на рынак, дзе Расія была манапалістам.

«Дасягнутыя ў Кіеве дамовы па транспарціроўцы ў Беларусь венесуэльскай нафты праз украінскую тэрыторыю не супярэчаць інтарэсам Расійскай Федэрацыі», — спрабаваў запэўніць Віктар Януковіч. Што цікава, Януковіч таксама павёў гаворку аб удзеле Украіны ў распрацоўцы венесуэльскіх нафтавых радовішчаў. Паўстала і пытанне пастаўкі венесуэльскай нафты нашай паўднёвай суседцы. Украіна, як і Беларусь, спрабуе аслабіць энергетычную залежнасць ад Расіі.

**Лукашэнка:**
**«Мы для Венесуэлы зробім столькі, што ты ніколі не пашкадуеш, што з намі звязаўся».**

У барацьбе з амерыканскім імперыялізмам Чавес фінансуе прыязныя для сябе рэжымы на Кубе, Антыгуа, у Нікарагуа і Балівіі. А вось унёсак у барацьбу з расійскім імперыялізмам ён можа зрабіць нечакана для сябе. У кожным разе, Чавес перадусім кіруецца меркаваннямі «прэстыжу». Менавіта гэты момант умела выкарыстоўвае Аляксандр Лукашэнка. Але гэта стварае і рызыкі: калі праект пастаўкі нафты груntуецца не на эканамічнай, а на палітычнай мэтазгоднасці, альтэрнатыўны паток нафты можа спыніцца так жа нечакана, як ён пацёк.



МАЛЮНАК СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

Рука руку мые.

Цікава, што на прэс-канферэнцыі ў Кіеве балбатлівы Чавес абмовіўся, што Пуцін перадаў разам з ім для Лукашэнкі нейкі падарунак. Што менавіта, не паведаміў. Але як бы тое ні было, новыя пагадненні дазваляюць беларускаму ўраду глядзець у бліжэйшую будучыню з асцярожным аптымізмам.

**Зміцер Панкавец**

Чавес прадае заводы ў Нямеччыне і купляе ў Беларусі? Старонка 4.

# Нарышкін: Дамаўляцца можна і з Лукашэнкам

Рэпартаж з прэс—канферэнцыі кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Расіі Сяргея Нарышкіна для беларускіх журналістаў.

Дарога ў Крэмль ляжала праз Спаскія вароты. Калі хто не ў курсе, то Спаская вежа — гэта са славутымі курантамі.

У дзвярах з надпісам «Службовы праход» стаяў толькі адзін ахоўнік. Ён уважліва углядваўся ў беларускія пашпарты, расшыфроўваючы экзатычную лацінку. Прычым, нярэдка зазіраў не на апошнюю старонку дакумента, а на шэнгенскія візы.

Прайшоўшы крыху ўздоўж чырвонага крамлёўскага муру, мы зайшлі ў пад'езд нумар сем. Там зноў чакаў хуткі пашпартны кантроль. На другім паверсе стаяў металашукальнік. З сабой дазвалялася браць толькі блакнот, асадку і дыктафон.

Рэдактар «Народнай волі» Іосіф Паўлавіч Сярэдзіч казаў на гэта, што 20 гадоў таму металашукальніка тут не было. Яны тады разам з Анатолем Майсенем прыязджалі да Міхаіла Гарбачова.

З Сярэдзіча сцябаліся, чаму ён не адправіў у Маскву свайго палітычнага аглядальніка Андрэя Саннікава? Наведванне патэнцыйным кандыдатам у прэзідэнты Крамля было б моцным крокам. Сярэдзіч на гэта адмахваўся, што позна спахапіліся, каб нешта мяняць.

Зала для прэс-канферэнцыі была досыць сціплай. Ніякага чаканай раскошы, візантыйскага стылю не заўважыў. Проста, але з густам. Вокны выходзілі на Красную плошчу, зусім побач з Маўзалеем.

Здзіўленнем было, што на сустрэчы не аказалася нікога з расійскіх журналістаў. Не вялася фота- і відэаздымка. Калі журналіст БТ Тухто паспрабаваў запытацца, чаму так, то пачуў, што гэта не мае значэння.

Журналістаў размясцілі вакол стала ў алфавітным парадку. Месца самога Сяргея Нарышкіна было ў цэнтры, побач з Русланам Бацянковым і Паўлам Шараметам.

На стале для кожнага ляжалі падрыхтаваныя сціплыя падарункі ў выглядзе нататніка і простага алоўка з надпісам «Крэмль». Шарамет жартаваў, што ў хатніх умовах так вострa затачыць аловак немагчыма. Сам Нарышкін увайшоў з процілеглага ўваходу. Ахова была зусім сціплая і нават не заўважная.

Пакуль Нарышкін зачытваў падрыхтаваны зварот, два старэнькія афіцыянты падавалі гарбату з лімонам, а таксама розныя піражкі. Чарвякоў у ежы не было. Дарэчы, білеты да Масквы і назад не аплачвалі. Гэта вам не прэс-туры расійскіх журналістаў.

Сяргей Нарышкін гаварыў ціха, але дастаткова для таго, каб яго ўсе чулі за сталом. «Мы лічылі і лічым Беларусь самым надзейным і верным партнёрам Расіі», — пачаў ён прамову.

Тым не менш, «балюча ўспрымаць беспадстаўныя абвінавачванні і папрокі ў наш бок ад беларускага кіраўніцтва. З пачаткам выбараў узмацнілася антырасійская рыторыка», — казаў Нарышкін.

На ягоную думку, такая палітыка беларускіх уладаў накіраваная на тлумачэнні памылак і праліказ у эканамічнай і сацыяльнай сферы. Ну а за што выступае Крэмль? «За ўмацаванне атмасферы даверу між дзвюма краінамі».

Канечне, усіх цікавіла, ці гатовая Расія прызнаваць вынікі выбараў у Беларусі. «Расіі не ўсё адно, які выбар будзе зроблены беларусамі. Але мы не ўмешваемся ва ўнутраныя справы краіны. Што да прызнання выбараў, то яно будзе залежаць не ад таго, хто стане прэзідэнтам, а ад законнасці і справядлівасці выбараў», — зазначыў Нарышкін.

«Нам важна ўсведамленне шкоднасці тых крокаў, што робіць Мінск па дыскрэдытацыі беларуска-расійскіх адносін», — запэўніў прадстаўнік Крамля. То бок, калі Лукашэнка пакаецца і прыдзе прасіць прабачэння, то ўсё будзе забыта.

Расійскі чыноўнік увогуле настойваў на тым, што павінны абавязкова выконвацца ўсе раней падпісаныя дамовы ў рамках інтэграцыі дзвюх краін. Гэта галоўнае патрабаванне.

Дзяржаўныя журналісты спрабавалі задаваць рэзкія правакацыйныя пытанні, лезці ў спрэчку з Нарышкіным, але той не паддаваўся. Працягваў сябе паводзіць абсалютна карэктна.

На пытанне «НН», чаму Расія толькі цяпер узгадала пра справы зніклых палітыкаў, быў наступны адказ: «Калі гэтае пытанне не падымалася афіцыйна, то не значыць, што яно нас не хвалявала».

Амаль адразу ў процівагу прагучала пытанне ад «Советской Белоруссии», як ідзе расследаванне гучных забойстваў у Расіі (Эстэміравa, Палііткоўская). «Вялікая праца ідзе. Хацелася б, каб у Беларусі назіралася такая ж інтэнсіўнасць у расследаванні гучных зніклненняў».

«Народная воля» пацікавілася, ці ёсць у Расіі відэакадры забойстваў Захаранкі, Ганчара. «Я пра такія запісы не ведаю», — адрэзаў Нарышкін. Ён увогуле быў куды менш жорсткі, чым Мядзведзеў у нядаўнім відэазвароце. Масква не ставіць крыж на Лукашэнку.

Што датычыць апазіцыі, то ён ведае «якія-ніякія імёны», але называць іх не захацеў. Зрэшты, не выключыў магчымасці нейкіх сувязяў паміж апазіцыяй і Крамлём. Дарэчы, гэтае пытанне прагучала ад карэспандэнта сайта «Гавары праўду». Можа, гэта і было адказам на чаканні некаторых кандыдатаў, што спадзяюцца на падтрымку Крамля.

«Хроснага бацьку» кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта глядзеў толькі кавалкамі, таму цэласнага ўражання не мае. «У журналістаў прошта перапоўнілася цярпенне», — зазначыў ён.

У Крамля ж, як выглядае, цярпенне ўсё ж крапчэйшае. Агулам прэс-канферэнцыя доўжылася гадзіну і дваццаць хвілін. Спыніць яе прапанаваў сам Нарышкін. Што хацеў, тое ён сказаў.

**Зміцер Панкавец, Масква—Мінск**



**Сяргей Нарышкін**

нар. у 1954 годзе ў Ленінградзе. Скончыў Ленінградскі механічны інстытут, Вышэйшую школу КДБ. Яшчэ пазней – Пецярбургскі міжнародны інстытут менеджмента. Валодае англійскай і французскай мовамі. У школе КДБ вучыўся разам з Уладзімірам Пуціным. Працаваў у пасольстве СССР у Бельгіі. З пачатку 1990–х займае розныя пасады ў мэрыі Санкт–Пецярбурга і Ленінградскай вобласці. З 2004 працуе ў Адміністрацыі прэзідэнта РФ. З мая 2008 — кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта. Гэта няпраўда, што Сяргей Нарышкін належыць да славутага расійскага роду Нарышкіных.

## Сцісла

• **Да завяршэння тэрміну збору подпісаў у падтрымку вылучэння кандыдатаў на пасаду прэзідэнта засталося дзесяць дзён.** Гэты этап выбарчай кампаніі пачаўся 30 верасня і будзе доўжыцца па 29 кастрычніка ўключна.

• **Кожны пяты расіянін дрэнна ставіцца да Лукашэнкі.** Амаль палова расіян (47%) лічаць, што паміж Масквой і Мінскам склаліся дрэнныя адносіны. Адказваючы на пытанне, чаму ў Масквы і Мінска паўсталі праблемы, 12% расіян заявілі, што ва ўсім вінаваты прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, які «вядзе няслушную палітыку ў адносінах да РФ». 20% расіян да Лукашэнкі ставяцца кепска.

• **Бакіеў па-ранейшаму знаходзіцца ў Беларусі.** Такім чынам ён аспрэчыў нядаўнія паведамленні шэрагу СМІ, па інфармацыі якіх Бакіеў вылецеў у Турцыю ў пачатку кастрычніка разам з Аляксандрам Лукашэнкам, які наведаў гэтую краіну з рабочым візітам.

**ЗП**

# Беларусь як вялікі чайна-таўн

### Што атрымаем з Кітая: крэдыты ці інвестыцыі?

Паводле афіцыйнай інфармацыі, Аляксандр Лукашэнка прывёз з Кітая тры крэдытныя пагадненні, восем камерцыйных кантрактаў і два рамкавыя пагадненні. Усяго на $3,5 мільярда.

### Што дзе?

Транспартная развязка на скрыжаванні праспекта Дзяржынскага і вуліцы Алібегава коштам $55,2 мільёна не можа акупіцца, таму яе фінансаванне будзе кітайцамі хутчэй за ўсё пракрэдытаванае. Наступны крэдыт мінскія дарожнікі хочуць узяць для стварэння інтэлектуальнай транспартнай сістэмы. На яе просяць $120 мільёнаў.

Лагістыку дапаможа аптымізаваць рэканструкцыя аэравакзала «Мінск-2» і будаўніцтва другой узлётна-пасадачнай паласы для прыёму самалётаў А-380.

Прамую выгаду для кітайцаў складана будзе атрымаць і пры стварэнні новых энергаблокаў для Бярозаўскай і Лукомльскай ГРЭС. Агульны кошт двух праектаў дасягае $1 мільярда.

З буйной прамысловасці кітайцаў цікавіць будаўніцтва заводаў. Завод індустрыяльнага домабудавання коштам $141 мільён, прадпрыемствы па вытворчасці сульфатнай беленай цэлюлозы ў Светлагорску і кальцынаванай соды. «Соль» два гады цікавіла аўстрыйцаў, але еўрапейскіх інвестыцый Лукашэнка так і не дачакаўся. Кітайцы ўкладваюць грошы, каб у будучыні атрымаць кантроль над прадпрыемствамі і карыстацца прадукцыяй.

### Малы Пекін — сталіца Беларусі

Нарэшце, «прапаганда кітайскага ладу жыцця». Азіяты гатовыя ўкладваць грошы ў архітэктуру са сваім нацыянальным каларытам. Не менш за $200 мільёнаў каштуе гатэль «Пекін», які з'явіцца да чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 годзе. Яго пабудуюць у цэнтры Мінска на беразе Свіслачы ў раёне вуліцы Чырвонаармейскай.

Галоўная фішка праектаў — два чайна-таўны. Такога Беларусь яшчэ не бачыла. Першаму з іх у раёне «Ржавец» прысвечаны асобны матэрыял, а вось месца другога высвятляецца. Мінскія ўлады прапанавалі кітайцам участак па вуліцы Маякоўскага, але тыя пакуль яшчэ не далі згоды.

### У чым сіла? — у грошах

Магчымасцяў кітайскай эканомікі дастаткова, каб скупіць усю вытворчасць Беларусі. Пакуль што азіяты паводзяць сябе ўзважана, не кідаючыся на амбразуру. Як Лукашэнка ні спрабуе «раскруціць» іх на шматмільярдныя крэдыты, тыя не паддаюцца. А надзея застаецца.

Віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка адзначыў, што на сустрэчы ў Кітаі закладзена аснова для шэрагу іншых праектаў. Агульная іх колькасць складае $18,5 млрд. Што казаць, калі гэта нават больш за даходы кансалідаванага бюджэту Беларусі за наступны год.

**Яўген Васількоў**

**Тавараабарот Беларусі і Кітая, $млрд**

| | |
|---|---|
| 2007 | 1,3 |
| 2008 | 2,2 |
| 2009 | 1,4 |

# У Батурынай адабралі мінскі раён «Ржавец»

### «Кітайскія інвестары пабудуюць у Мінску раён «Лебядзіны», —

заявіў начальнік упраўлення інвестыцый камітэта эканомікі Мінгарвыканкама Мікалай Ахроменка. Хоць гарадскі чыноўнік і ўжыў назву «Лебядзіны», размова вялася пра мікрараён каля «Мінск-Арэны» і рынку «Ждановічы», які называецца «Ржавец». Адпаведнае рашэнне было прынята мінскім саветам дэпутатаў некалькі гадоў таму.

Мікалай Ахроменка агучыў канкрэтныя ўмовы беларуска-кітайскага супрацоўніцтва. Праект рэалізуецца сумесна з пекінскай кампаніяй «Хуа-О». Яе інтарэсы ў Беларусі прадстаўляе прадпрыемства «Чжун-Цінь Аб'яднанне», якое і будзе ажыццяўляць будаўніцтва.

Архітэктурнае аблічча збудаванняў, элементы ландшафтнага дызайну, што ўваходзяць у склад будучага жылога комплексу, «будуць адлюстроўваць нацыянальныя і гістарычныя асаблівасці кітайскай архітэктуры». Карацей, яшчэ адзін чайна-таўн.

Усё б нічога, калі б гэты мікрараён у свой час не быў паабяцаны жонцы былога мэра Масквы Юрыя Лужкова Алене Батурынай і яе кампаніі «Інтэка». Яшчэ ў 2006 годзе масквічы адхапілі «гуртам» некалькі прэстыжных тэрыторый у Мінску: «Мінск-сіці», хмарачосы каля станцыі метро «Фрунзенская», забудова на праспекце Дзяржынскага, мікрараён «Ржавец».



**Кітайскі праект забудовы квартала.**

Быў зацверджаны праект забудовы «Ржаўца», вызначаны інвестар — «Банк Масквы». Раён распрацоўваўся цалкам па маскоўскіх нормах, а кіраўніком праекта з'яўляўся першы намеснік галоўнага архітэктара Масквы Юрый Грыгор'еў. Прапановы абодвух бакоў можна параўнаць на рэндарах. Цікава, што расіянам паабяцалі плошчу 35,72 га, а вось кітайцам трохі большую — 36,2 га.

Пры тым, што кантракт з кітайцамі вось-вось будзе падпісаны, ад супрацоўніцтва з расіянамі таксама ніхто не адмаўляецца! Усё той жа Мікалай Ахроменка пацвердзіў, што «праектам Алены Батурынай у Мінску нічога не пагражае».

**ЯВ**

# Трэцяя лінія метро будзе каштаваць $380 мільёнаў

### Тым часам першая лінія падоўжыцца да Малінаўкі ў 2013—м.

Мінскія ўлады гатовыя да будаўніцтва трэцяй лініі метро. Да канца гэтага года павінна быць падрыхтавана абгрунтаванне інвестыцый у будаўніцтва першага ўчастка.

У 2017 годзе павінны адкрыцца станцыі, якія злучаць Курасоўшчыну з Юбілейнай плошчай, дзе цяпер знаходзіцца станцыя «Фрунзенская» другой лініі метро.

Паводле слоў дырэктара ААТ «Мінскметрапраект» Валерыя Чаканава, працягласць трэцяй лініі складзе 8,4 кіламетра, у яе ўвойдуць шэсць альбо сем станцый і электрадэпо, якое ўзнікне ў раёне вуліцы Каржанеўскага каля МКАД.

Праўда, ёсць у плане і адна нявызначанасць, звязаная з тым, што раней меркавалася, што першай станцыяй будзе «Каржанеўская», але праз цяжкасці будаўніцтва ад яе, магчыма, адмовяцца. У такім выпадку першай станцыяй стане «Лошыцкая». Яна не мае прамога дачынення да мікрараёна Лошыца, але будзе звязаная з ім новай дарогай. Наступнай станцыяй будзе «Аэрадромная». Яна будзе пабудавана ў цэнтры комплексу «Мінск-сіці» і можа атрымаць адпаведную назву. Працоўныя назвы наступных станцый — «Жукоўская», «Вакзальная» з перасядкай на першую лінію, «Клары Цэткін» і «Юбілейная» — з перасядкай на другую.

### Паўмільярда разам з праходчым комплексам

Электрадэпо каля «Юбілейнай» будавацца не будзе, цягнікі змогуць скарыстацца тым, якое ўжо ёсць на «Фрунзенскай». Валерый Чаканаў мяркуе, што пабудаваць першы ўчастак трэцяй лініі будзе складана, бо станцыі прыйдзецца заглыбляць — лінія пройдзе пад Лошыцкай воднай сістэмай, транспартнымі развязкамі, шчыльнай жыллёвай забудовай і чыгункамі.

Кошт будаўніцтва метро складае ў сярэднім каля $45 мільёнаў за адзін кіламетр, а хуткасць — прыкладна 1,25 кіламетра ў год. Такім чынам, першы ўчастак будзе каштаваць як мінімум $380 мільёнаў. Рэальны кошт будзе большым, бо ў наступным годзе давядзецца купляць сучасны праходчы комплекс.

«Будаўніцтва трэцяй лініі без гэтага комплексу немагчымае», — заявіў начальнік УП «Дырэкцыя па будаўніцтве метрапалітэна» Павел Царун. Хуткасць будаўніцтва з яго выкарыстаннем павялічыцца ў 4—5 разоў.

### Метро даедзе да Шчомысліцы?

Што да ўжо будаваных станцый першай лініі метро «Грушаўка», «Міхалова» і «Пятроўшчына», то іх адкрыццё чакаецца ў другім паўгоддзі 2012 года. Чацвёртая станцыя, «Малінаўка», будзе пабудаваная да канца 2013 года.

Магчыма, што гарадскія ўлады вырашаць будаваць з наскоку яшчэ адну станцыю — «Шчомысліца». Раён з такой назвай пачнуць узводзіць за МКАД налета. Там з'явяцца і гіганцкі стадыён, і Нацыянальны выставачны комплекс. Рашэнне было б эканамічна мэтазгодным, бо тады не прыйдзецца выдаткоўваць грошы ажно на тры даражэзныя электрадэпо — пасля «Пятроўшчыны», «Малінаўкі» і «Шчомысліцы». Іх будзе ўсяго два, без «малінаўскага».

**ЯВ**




# Чавес прадае сваю долю ў нямецкіх кампаніях і купляе ў беларускіх?

### Расія прыйдзе на еўрапейскі нафтавы рынак праз Венесуэлу.

Перад візітам у Беларусь прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес наведаў Расію, дзе таксама раздаваў абяцанкі направа і налева. У прыватнасці, ён паабяцаў прадаць «Роснефти» палову нямецкай Ruhr Oel, якая валодае часткамі акцый у чатырох нафтаперапрацоўчых заводах сваёй краіны.

«Гэтая ўгода вызваліць венесэльскую дзяржаўную кампанію ад непатрэбнага актыву і дасць магчымасць інвеставаць у іншыя галіны эканомікі», — заявіў Уга Чавес.

Расія ж зацікаўленая ў куплі праз цяперашнюю геапалітычную сітуацыю — дзяржаўныя нафтагазавыя кампаніі ахапілі Усходнюю Еўропу і прагнуць пашырэння на цэнтральную частку кантынента.

Дзякуючы венесуэльскай дапамозе, Расія зможа выйсці на еўрапейскі рознічны рынак паліва. Гэтыя актывы стануць першым набыткам «Роснефти» за мяжой. Высветлілася, што нямецкія нафтаперапрацоўчыя заводы якраз арыентаваныя на цяжкую нафту — тую, якую здабываюць расіяне. Іншых такіх заводаў у Еўропе фактычна няма. Паколькі заводы на тэрыторыі Расіі перапрацоўваюць толькі палову ад нафты, што здабываецца ў Расіі, паліва хопіць, каб загрузіць і нямецкія заводы.

Застаецца загадкай, чаму Чавес прадае заводы ў Германіі і пры гэтым намякае пра планы будоўлі аналагічных заводаў у Беларусі.

**ЯВ**

## Сцісла

• **Будаўніцтва беларускай АЭС адкладаецца?** Намеснік міністра энергетыкі Беларусі Юры Рымашэўскі заявіў, што два блокі беларускай АЭС з агульнай магутнасцю 2340 МВт будуць поўнасцю ўведзеныя ў дзеянне ў 2020 годзе. Раней улады паведамлялі, што першы блок АЭС мае запрацаваць у 2016 годзе, а другі — у 2018.

• **Лукашэнка ўхваліў размяшчэнне дзяржаблігацый на расійскім рынку.** Арганізатарамі выпуску стануць Сбербанк Расіі і яшчэ два банкі. Такім чынам, беларускі ўрад пазычыць яшчэ прыкладна паўмільярда даляраў.

• **Беларуская кампанія «Белруснафтагаз», створаная пры ўдзеле ўрада Беларусі, пабудуе 18 лагістычна-гандлёвых цэнтраў у Расіі.** Будынкі будуць выкананыя ў адзіным архітэктурным рашэнні. У першую чаргу будаўніцтва пачнецца ў Ніжнім Ноўгарадзе і Казані.

• **У Беларусі вынайдзены новы від нерухомасці — машына-месца.** Цяпер месца для стаянкі аўтамабіля стане прасцей купляць і прадаваць.

• **Замежныя чыпсы падаражаюць.** Указам кіраўніка дзяржавы яны выключаны з пераліку тавараў з ужываннем зніжанага ПДВ.

• **Самыя танныя гатэлі ў свеце знаходзяцца ў Рызе.** Такія вынікі атрымаліся ў выніку інтэрнэт-апытання. У Рызе нумар у гатэлі за суткі ў сярэднім каштуе $83. Далей ідуць Талін і Банкок. Гаворка ідзе пра гатэлі люкс-класа. Апытанне не ўлічвала цэнаў у беларускіх райцэнтрах.

**ЯВ**

# Дабрачыннасць у эпоху facebook

Гэтыя людзі штомесяц па ўласнай волі пераводзяць грошы хворым дзецям...

Таццяна Салдаценка нарадзілася праз два дні пасля Чарнобыля. Чатыры гады апякуецца пацыентамі дзіцячага анкагематалагічнага цэнтра, але супадзенне датаў нараджэння і жахлівай катастрофы лічыць проста супадзеннем. «Я заўсёды хацела камусьці дапамагчы», — кажа Таццяна. Так яна ўрэшце і трапіла з групай валанцёраў у Бараўляны.

Дабрачыннасць у такім месцы — псіхалагічна цяжкая праца. Першыя гады Таццяна займалася акурат маральнай падтрымкай хворых — цэлымі днямі бавіла з імі час. Дзяўчыну папярэдзілі, што, па статыстыцы, каля 70% дзяцей адольваюць хваробу. Але яна і не ўяўляла сабе, што азначае рэшта гэтай сухой статыстыкі. Дзіма, Андрэй, Саша, зямлячка Люда...

Яны адыходзілі адзін за адным, а Таццяна давала сабе зарок больш не ездзіць у Бараўляны. Валанцёрства тут — гэта калі ты жывеш не сваім жыццём, а радасцямі і горам тых, каму дапамагаеш.

Усе падапечныя Таццяны рабіліся яе сябрамі. Яна знаёмілася з іх роднымі, развітвалася з імі назаўсёды.

У пачатку гэтага года побач з бараўлянскім анкацэнтрам Таццяну збіла машына. Лячэнне і рэабілітацыя занялі восем месяцаў. Але няма ліха без дабра — дзякуючы таму здарэнню Таццяна знайшла сабе мужа. Пачала новы этап у жыцці.

Яна больш не магла аддаваць усю сябе маральнай падтрымцы хворых дзяцей, але і спыніцца не здолела. Вырашыла займацца дапамогай матэрыяльнай, якая дазваляе трымаць дыстанцыю з падапечнымі. Пры гэтым Таццяна катэгарычна супраць параўнання такой метамарфозы з паэтапным пазбаўленнем ад шкоднай звычкі. «Калі ўцягнуўся ў гэтую справу, то кінуць яе нашмат цяжэй, чым пачаць. Практычна немагчыма».

### Сумнае лідарства Гомельшчыны

«Што б ні казалі, а гомельскіх у анкацэнтры шмат. І не так з вобласці, як акурат з Гомеля», — заўважае Таццяна.

Страшная хвароба не шкадуе ні бедных, ні багатых. Шмат дзетак з неўладкаваных сем'яў.

Здараецца і так, што моцныя сем'і руйнуюцца хваробай — хворага трэба доўга глядзець, хтосьці з бацькоў вымушаны месяцамі сядзець у бальніцы. Губляецца праца, муж пачынае піць...

Побыт бацькоў у Бараўлянах варты асобнай тэмы. Паўстае пытанне начлегу, харчавання, асабістай гігіены. «Спяць, як удасца, бо адмысловых пакояў для родных не прадугледжана», — кажа валанцёрка.

Для малых дзетак патрэбныя памперсы, на якія ў іх мацярок, якія часта застаюцца са сваёй бядой сам-насам, проста не стае грошай.

З гэтымі пытаннямі Таццяна сутыкнулася з першых дзён сваёй дзейнасці, актуальнымі яны застаюцца і цяпер.

### Сацыяльныя сеткі — бяда і шчасце

Пры канцы 1980-х газета «Піянер Беларусі» (сёння — «Раніца») ініцыявала першы ў краіне збор сродкаў для лячэння скалечанага электратокам хлопчыка. Тады гэта было ў навінку і ўгаворваць ахвяраваць грошы арганізатарам амаль не даводзілася.

Сёння ж многія газеты маюць адмысловыя рубрыкі. Падобнымі гісторыямі, калі некаму тэрмінова трэба сродкі на аперацыю за мяжой, перапоўнены інтэрнэт. Людзі перасычаныя, прызнае Таццяна, многіх апаноўвае перакананне, што «ўсім не дапаможаш», а каго-нікага жаласлівыя гісторыі пачынаюць раздражняць не менш, чым навязлівыя піяр-кампаніі мабільных аператараў.

І тым не менш, Таццяна лічыць, што развіццё інфармацыйных тэхналогій дае нашмат больш перавагаў, чым шкоды. Дзякуючы сацыяльным сеткам і блогам яна значна пашырыла кола дабрачынцаў. Пры гэтым Таццяна адчула палёгку ад таго, што цяпер працуе найбольш з незнаёмымі людзьмі, якім яна ні чым не абавязаная, як, зрэшты, і яны ёй. З'яўленне сістэмы электронных плацяжоў таксама спрые валанцёрам.

### Клуб 5000

Пераключыўшыся з маральнай дапамогі на матэрыяльную, Таццяна нейкі час збірала грошы па сябрах і знаёмых. Давалі хто колькі зможа. Хтосьці саромеўся, што мала ахвяруе, многія ленаваліся пераказаць грошы.

Тады ўзнікла ідэя стварыць суполку, сябры якой ахвяравалі б раз на месяц фіксаваную суму. Так год таму ўтварыўся Клуб пяцітысячнікаў — кожны, хто да яго далучаецца, пераказвае на рахунак EasyPay 5000 рублёў у месяц. Ахвяраванні дзеляцца паміж падапечнымі клуба — пацыентамі дзіцячага анкагематалагічнага цэнтра.

На сёння іх чатыры чалавекі, сярод іх супрацоўніца Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра дзіцячай анкалогіі і гематалогіі Віялета Гаўрына, якая аддала працы з дзецьмі 17 год. Складкі ідуць на самае неабходнае, бо па большасці падапечныя клуба — дзеці з малазабяспечаных сем'яў.

Насці Навумавай у чэрвені набылі мабільны тэлефон для сувязі з мамай і бабуляй.

Крысціне Лук'янчык трэба адмысловыя прэпараты, каб пераадолець наступствы хваробы. Дзянісу Мажараву — спецыяльнае харчаванне.

«Мы набываем сваім падапечным прадукты, лекі, часам не зарэгістраваныя ў Беларусі, біялагічна актыўныя дадаткі».

Для актыўных карыстальнікаў інтэрнэту: Клуб 5000 мае прапіску ў facebook, вконтакте і livejournal.

### «Мёртвым грошы не патрэбныя»

Кажуць, свет не без добрых людзей. Але хапае між нас і нелюдзяў. Аднойчы «вконтакте» да Таццяны звярнуўся незнаёмец. Прапанаваў стварыць сайт падтрымкі канкрэтнага хворага дзіцяці, арганізаваць збор сродкаў, а потым... забраць іх сабе. «Мёртвым грошы не патрэбныя, а мы можам зарабіць дзясяткі тысяч даляраў», — угаворваў «разумнік».

«Мяне палохае і абурае, што такія людзі ёсць», — кажа яна.



**Для Таццяны Салдаценкі дабрачыннасць стала жыццём.**

Пералічыць грошы на лячэнне Віялеты Гаўрынай можна на рахунак:

ААТ «ААБ Беларусбанк», аддзяленне №176, Ф-л №511

УНН 100349858

Код банка: 153001815

Рахунак №01022572

Транзітны рахунак №3819382103561

Адрас банка: г. Мінск, вул. Ванеева, 18.

Грошы таксама можна пералічыць праз інтэрнэт на кашалёк EasyPay №08492425, не забудзьцеся пазначыць: на лячэнне Віялеты Гаўрынай.

Недавер да акцый па зборы грошай для хворых мае падставы. Адна сям'я пачала збіраць грошы на перасадку спіннога мозгу для сваёй дачкі. Сабралі 40 тысяч даляраў, потым 100, а затым і ўсе 200. І толькі пасля гэтага высветлілася, што аперацыя не патрэбная, што, пачаўшы збіраць грошы, бацькі нават не парупіліся адшукаць неабходную клініку. Акцыя шырока асвятлялася і прыцягнула ўвагу. Тым часам камусьці аперацыя сапраўды была жыццёва неабходная...

Давярай ды правярай. Таццяна раіць усім, хто займаецца падобнымі справамі, наведваць у такія сем'і, каб пераканацца ў неабходнасці збору сродкаў, пабачыць на ўласныя вочы неабходныя дакументы.

### Валанцёрамі нараджаюцца

Валанцёр — гэта не прафесія, гэта стан душы, жаданне за проста так дапамагаць іншым людзям. Людзі такімі нараджаюцца. І іх мала. Штодзень Таццяна праз сацыяльныя сеткі знаёміць са справамі клуба каля 40 чалавек. З іх у сярэднім 4 чалавекі дэкларуюць уступленне ў клуб. І толькі адзін застаецца.

На сёння ў клубе каля 2000 чалавек, з іх сотня ахвяруе грошы больш-менш рэгулярна (за месяц набягае ад 300 да 600 тысяч рублёў). З іх толькі паўтара дзясятка адважваюцца на нешта большае за паход да бліжэйшай пошты. Гэтыя пятнаццаць выявіліся сапраўднымі валанцёрамі.

Таццяна прызнаецца, што ў самой яе валанцёрства займае каля паловы яе вольнага часу. Але гэта сухі падлік, бо насамрэч гэтым жывеш увесь час.

**Сямён Печанко**

# Міхася Башуру вызвалілі ў зале суда




У сваім апошнім слове ён чытаў вершы.

Суддзя Кірыл Палулех прызнаў паэта і актывіста кампаніі «Гавары праўду» вінаватым у парушэнні артыкула 380 Крымінальнага кодэкса (падробка, выраб, выкарыстанне або збыт падробленых дакументаў, штампаў, пячатак, бланкаў). Мелася на ўвазе даведка пра прыбыткі, афармляючы якую, Башура завысіў лічбы сваіх заробкаў. Як ён сцвярджаў — проста памыліўся.

«Але гэтая памылка не прывяла да таго, што камусьці давялося два з палавай месяцы туляцца па ізалятарах. Да гэтага прывялі шматлікія памылкі органаў папярэдняга дазнання», — адзначыў Башура ў сваім апошнім слове.

Таксама Башура заявіў, што выгады ад гэтай падробкі ён не атрымаў. У часе суда абарона адзначала, што для атрымання льготнага крэдыту сума прыбыткаў мае быць якнайменшая, а падсудны пазначыў завышаную.

«Злачыннага намеру не было, выгады не атрымаў, шкоды не нанёс. Прашу высокі суд мяне апраўдаць», — казаў Башура. Пры канцы выступу ён прачытаў два свае вершы. Адзін з іх, «Малюнак», Башура напісаў на Валадарцы. Прысутны ў зале суда Уладзімір Някляеў выгукнуў: «Малайчына!» Слухачы, што прыйшлі падтрымаць Башуру, віталі вершы воплескамі.

Пракурор патрабаваў пакараць Башуру паўгодам арышту, але канчатковы вырак быў больш мяккі: штраф у памеры 500 базавых велічыняў (17 мільёнаў 500 тысяч рублёў).

Міхась Башура і яго адвакат Тамара Сідарэнка бліжэйшым часам вырашаць, ці будуць яны абскарджваць прысуд. На пытанне, ці лічыць ён справу палітычна матываванай, Башура сказаў, што следчыя на допытах не хавалі сувязі яго ўдзелу ў кампаніі «Гавары праўду» з судовым пераследам.

Аднак спыняць грамадскую актыўнасць ён не збіраецца. Башура плануе абнародаваць тое, пра што дазнаўся ў зняволенні. «У беларускіх турмах паміраюць здаровыя людзі. Літаральна нядаўна два чалавекі памерлі на Валадарцы», — казаў ён.

Башура адзначыў, што вызваленне стала магчымым дзякуючы ўвазе СМІ да яго справы.

**Сяргей Мікулевіч**



**Капітан беларусаў Міхаіл Сівакоў (злева) не праходзіць у асноўны склад італьянскага «Кальяры». Можа, пасля перамогі ў Барысаве трэнеры звернуць на Мішу ўвагу.**

# Чао, Італія!

**Моладзевая зборная Беларусі па футболе ў трэці раз у сваёй гісторыі прабілася на чэмпіянат Еўропы па футболе.**

Гэта адкрывае перад намі выдатныя віды на лонданскую Алімпіяду-2012.

Першы прарыў быў у 2004 годзе. Каманду Юрыя Пунтуса прынята называць самай таленавітай генерацыяй у гісторыі беларускага футбола. З кашулі той каманды выраслі два браты Глебы, Цімох Калачоў, Юрый Жаўноў. Выйсці з групы тады нашым не дазволіла толькі жахлівае судзейства румына Тудара.

Дарэчы, у будучыні Тудар яшчэ двойчы абслугоўваў матчы нашых каманд. Але той першапачатковай крывакрэрнасці не было і блізка. Магчыма, і ў рэферы здараюцца крытычныя дні.

Ну а год назад нашы хлопцы ўдзельнічалі ў першынстве ў Швецыі. Назваць той выступ удалым не выпадае, але сам факт выхаду ў васьмёрку наймацнейшых каманд Еўропы заслугоўвае вялікага. У нацыянальнай зборнай замацаваліся Кісляк, Пуціла, Мартыновіч, Шытаў.

Той выхад азмрочыўся вялізнай трагедыяй. Так і не змог апраўціца пасля паразаў трэнер «маладзёжкі» Юры Курненін. Праз некалькі дзён пасля скончэння першынства яго знайшлі мёртвым. Сэрца проста не вытрымала напружанасці, той крытыкі, што навалілася на настаўніка.

Справу Курненіна ўзяўся працягваць яго вучань і сябар Георгій Кандрацьеў. У свой час Жора быў адным з любімцаў мінскай публікі. Людзі хадзілі на стадыёны, каб паглядзець славутую гульню галавой Кандрацьева.

Але добры футбаліст — гэта яшчэ не значыць добры трэнер. Кандрацьеў гэтыя якасці спалучыў.

Негаваркі, суровы, нават пануры. Такое ўражанне робіць Кандрацьеў. Але самі футбалісты яго любяць і гатовы публічна бараніць. Ужо па выхадзе ў фінальны раўнд нашы хлопцы прызнаваліся, што «прысвяцілі перамогу Пятровічу».

У вырашальнай гульні нашы сышліся з італьянцамі. Сярод моладзевых каманд апеніінцы моцныя, як ніхто. Яны пяць разоў выйгравалі кантынентальныя чэмпіянаты.

Першая гульня гэтыя песімістычныя прагнозы пацвердзіла — беларусы прайгралі з лікам 0:2. Праз тры дні ў Барысаве ўсё стала з ног на галаву. На працягу першых пяці хвілін намаганнямі магілёўца Юрчанкі лік ужо быў 2:0. У дадатковы час псіхалагічная перавага была ўжо на нашым баку.

Італьянцам жа давялося адмяніць банкет, што быў загадзя замоўлены. Італьянскія «тыфозі» не перастаюць шпурляць маланкі ў зборную, трэнера, федэрацыю.

Выхад на дацкае першынства адкрывае перад нашымі хлопцамі выдатную перспектыву на Алімпіяду-2012 у Лондан. Для гэтага неабходна будзе выйсці з групы.

Поспехі «маладзёжкі» сведчаць пра тое, што яшчэ ў юнацкім узросце нашы хлопцы нічым не прайграюць футбольным грандам, але з часам гэтая прорва большае.

Справа ў тым, што беларусы хутчэй за сваіх еўрапейскіх аднагодак прабіваюцца ў асноўныя склады каманды, маюць стабільную гульнявую практыку, хутчэй развіваюцца ў майстэрстве. У той жа час нейкі італьянскі талент вымушаны марнавацца ў запасе свайго клуба.

Тым не менш, у італьянскага футбаліста ёсць матывацыя расці далей, каб выціснуць з асноўнага часу некага з лідараў, а вось беларус спыняецца ў развіцці, бо дасягнутага ўзроўню яму ўжо дастаткова.

Пакуль няма дакладных лекаў, як з гэтай напасцю змагацца. Найбольш распаўсюджаны рэцэпт — з'язджаць маладым у моцныя еўрапейскія чэмпіянаты. Некаторым, як Глебу і Кутузаву, гэта пайшло на карысць. А шмат жа хто з папярэдніх складаў моладзевай зборнай згубіліся, так і не загулялі на высокім узроўні.

Зрэшты, як бы там ні было, але год для беларускага футбола пакуль самы пасляховы. Беларусь у еўракубках мае рэкордны рэйтынг, а БАТЭ прэтэндуе на выхад з групы Лігі Еўропы. Нацыянальная зборная сыходзіць на зімовыя вакацыі з добрымі шанцамі на выхад на першынства Еўропы. Моладзь з задачай ужо справілася.

**Зміцер Панкавец**

КРЫМІНАЛ

# У Мінску злавілі маньяка-педафіла

**На ягоным рахунку — дзясятак гвалтаў над дзяўчынкамі.**

Мінскія праваахоўнікі выкрылі серыйнага маньяка, які на працягу 1990-х здзейсніў як мінімум дзесяць згвалтаванняў дзяўчынак ва ўзросце ад 8 да 13 гадоў.

Падазраваны быў арыштаваны яшчэ 12 лютага. Аднак толькі цяпер сталі вядомыя вынікі найскладанейшых экспертызаў, якія дазволілі крыміналістам зрабіць выснову аб тым, што абвінавачаны — той самы мінскі маньяк па мянушцы Брудны. Так яго празвалі сталічныя вышукоўцы, якія беспаспяхова спрабавалі знайсці злачынцу пачынаючы з 23 красавіка 1992-га, калі быў зарэгістраваны першы выпадак нападу на дзіця. У тым жа годзе — 3 верасня і 25 лістапада — ахвярамі сталі яшчэ дзве дзяўчынкі.

У 1993 годзе маньяк выходзіў на сваё «паляванне» двойчы: 1 лютага і 9 красавіка. У 1994-м на яго сумленні згвалтаванні, здзейсненыя 14 студзеня і 7 лістапада. Яшчэ тры злачынствы адбыліся ў 1995 годзе: 23 лютага, 25 красавіка і 6 верасня.

Маньяк высочваў дзяцей, якія вучыліся ў першую змену; бацькі, як правіла, былі на працы.

Калі яны вярталіся дадому са школы, ён ішоў за імі да дзвярэй кватэры. Часам звяртаўся да сваіх ахвяраў з просьбай зайсці патэлефанаваць або напісаць запіску суседзям, якіх нібыта не было дома. Галоўнае для яго было пераканацца, што дарослыя ў кватэры адсутнічаюць. Што было далей, мовай міліцэйскіх пратаколаў называецца «згвалтаваннем у натуральнай і вычварэнскай форме».

Вядома пра дзве «няўдачы» маньяка. У першым выпадку дома




**Напалоханыя ахвяры давалі зусім розныя апісанні злачынцы.**

апынуўся бацька юнай школьніцы, які па-свойму разабраўся з няпрошаным госцем, і той вымушаны быў адступіць з сіняком пад вокам і драпінамі на шчацэ. У другім за дзіця заступілася аўчарка. Ад той сустрэчы з сабакам у маньяка на назе павінны былі застацца сляды іклаў.

Ахвяры праз розны ўзрост і стан шоку апісвалі маньяка па-рознаму. Са словаў пацярпелых былі складзены чатыры фотаробаты. Некалькі дзяўчынак сцвярджалі, што «дзядзька быў неахайна апрануты і ад яго дрэнна пахла». Адсюль і мянушка маньяка — Брудны.

Не выключана, што пасля сустрэчы з сабакам мінскі маньяк змяніў тактыку. У 1996 і 1998-м у сталіцы зарэгістравалі яшчэ некалькі выпадкаў гвалту над малалетнімі дзяўчынкамі.

У кватэры ён больш не пранікаў, а сваіх ахвяр выбіраў на вуліцы. Так, напрыклад, 15 снежня 1998 педафіл са словамі «Будзеш крычаць — заб'ю» ўзяў за локаць дзяўчынку, якая стаяла ля камерцыйнага кіёска, і праехаў з ёй на тралейбусе некалькі прыпынкаў. Малая ад нечаканасці і страху моўчкі выконвала загады мужчыны ў скуранoй куртцы і вязанай шапачцы. Па дарозе ён расказваў, што развёўся з жонкай, павінен перадаць ёй і дзецям грошы. Затым зацягнуў ахвяру ў пад'езд, увайшоў у ліфт і націснуў кнопку апошняга паверха...

Следства, па сутнасці, толькі пачалося. Пра падазраванага вядома пакуль няшмат. Яму 40 гадоў, да арышту працаваў кіроўцам у кампаніі, якая спецыялізуецца на перавозках грузаў па Беларусі, краінах Еўропы і СНД. Таксама інфармацыя для разваг, якая, не выключана, можа растлумачыць, чаму напады на дзяцей у Мінску спыніліся. Ці не пачаліся яны ў іншых краінах?

**naviny.by**

## Здарэнні сцісла

• **Беларус у Чыце ўзяў 15-гадовую школьніцу ў рабства.** 33-гадовы ўраджэнец Беларусі падазраецца ў незаконным пазбаўленні волі. 31 жніўня дзяўчынка сышла з дому ў пасёлку Пясчанка пад Чытой (Расія, Сібір), дзе жыла з бацькамі, і лічылася зніклай без вестак. Па факце яе знікнення была распачатая крымінальная справа аб забойстве.
15 кастрычніка школьніцу пры праверцы аператыўнай інфармацыі знайшлі ў цэнтры Чыты, у кватэры, якую наймала прыезджая сямейная пара.
Як лічаць аператыўнікі, сямейная пара сілком утрымлівала дзяўчынку пад замком. У кватэры, дзе жыў ураджэнец Беларусі, аператыўнікі таксама выявілі цэх па вырабе кантрафактных відэадыскаў. Тэхнічнае абсталяванне і выробленая прадукцыя падчас вобшуку канфіскаваныя.

• **Самалёт Мінск—Амстэрдам здзейсніў вымушаную пасадку.** Самалёт вярнуўся ў Нацыянальны аэрапорт «Мінск-2». Прычынай вяртання стала трэшчына кокпіта — лабавога шкла — падчас узлёту. На борце знаходзіліся 23 чалавекі. Пацярпелых няма.

• **У смерці Сашы Ферары нікога не вінавацяць.** У мінулы панядзелак на праспекце Незалежнасці адбылася страшная аварыя («НН» №38). У сутыкненні матацыкла, за рулём якога сядзеў чэмпіён Беларусі па картынгу Аляксандр Кручынскі (Саша Ферары), з машынай хуткай дапамогі маладому хлопцу адарвала галаву. Па гэтым здарэнні завялі крымінальную справу. Адразу пасля аварыі ва УДАІ Мінска казалі, што «хуткая» рабіла левы паварот і мусіла саступіць дарогу сустрэчнаму транспарту.
Сведкі ж здарэння сцвярджаюць, што матацыкліст імчаўся на вялізнай хуткасці, так што хуткая магла яго не заўважыць.

• **Сельпо абчысцілі дзяўчаты.** У вёсцы Запруддзе (Шаркаўшчынскі раён) абчысцілі краму. Рабаўнікі ўзламалі засовы і вынеслі з крамы прадукты, алкаголь, цыгарэты больш як на 4 млн рублёў. Рабаўніцамі аказаліся 17-гадовая вучаніца мясцовага ПТВ і на год старэйшая за яе беспрацоўная.

• **Пакваціліся на катэджы Мінскага раёна.** Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Ждановіцкага аддзела міліцыі Мінскага РУУС затрымалі дваіх жыхароў Валожынскага раёна за серыю крадзяжоў з катэджаў у пасёлках Ратамка і Хацежына, вёсцы Юхнаўка Мінскага раёна. Зламыснікі дасканала рыхтаваліся да злачынных дзеянняў: днём адсочвалі прывабныя дамкі, выбіралі тыя, што без ахоўнай сігналізацыі, а ноччу прыязджалі «на справу». Выломлівалі замкі і выносілі ўсё, што трапляла пад руку — ад бытавой тэхнікі, аўдыя- і відэаапаратуры. Прыкладны кошт скрадзенага — звыш 10 мільёнаў рублёў. Чужое дабро збывалася на рынку ў Ждановічах.

**СМ; БелаПАН, «Еўрарадыё», БЕЛТА**

# Аперацыя Ы, або Байкот выбараў

Піша **Віталь Тарас**.

Адзін з маральных урокаў, які я атрымаў ад свайго бацькі на ўсё жыццё, быў звязаны з выбарамі.

Атрымаўшы ў 18 гадоў «сярпасты і малаткасты» савецкі пашпарт, неўзабаве я ўпершыню ўдзельнічаў у галасаванні. Не памятаю ўжо, каго і куды выбіралі — здаецца, гэта былі выбары дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР. Але памятаю, што бацька зрабіў так, як заўсёды ў такіх выпадках — выкрасліў з бюлетэня імя кандыдата.

Тут варта, мабыць, патлумачыць, што выбары за савецкім часам былі безальтэрнатыўнымі — у бюлетэнях было імя толькі аднаго чалавека на адно дэпутацкае месца. І аніякіх пазнакаў «за» ці «супраць». Выбарцу заставалася толькі ўкінуць бюлетэнь у скрыню. Для гэтага не трэ было нават заходзіць у кабіну для галасавання: проста бярэш бюлетэнь і, не чытаючы, кідаеш адразу ў скрыню. Так абсалютная большасць савецкіх выбарцаў і рабіла. Але быў яшчэ адзін варыянт — выкрасліць імя кандыдата з бюлетэня, што азначала галасаванне «супраць».

Мне таксама карцела так зрабіць. Але, як толькі я прыйшоў на выбарчы ўчастак (прыйшоў туды сам), пабачыў каменныя твары чальцоў выбарчай камісіі, адзін з якіх запісаў звесткі з майго пашпарта і выдаў бюлетэнь, пабачыў міліцыянта ля скрыні, рашучасць мяне пакінула. Усё ж я прымусіў сябе ўвайсці ў адну з кабінак, на якой вісела цяжкая, нібы набрынялая барваю, заслона са штучнага аксаміту, і захінуць яе за сабой. Сеў у крэсла, узяў у рукі казённую асадку... І тут мужнасць мяне пакінула канчаткова. Я склаў бюлетэнь, выйшаў і ўкінуў яго ў скрыню.

Дома, чырванеючы, распавёў бацьку усё як было. А пасля пачаў апраўдвацца. Мармытаў нешта накont таго, што няма ніякай розніцы — выкрэсліваць ці не выкрэсліваць. Усё адно кандыдат адзін, хай сабе будуць некалькі чалавек супраць, яго ж усё адно абяруць. А яны, улады, нават не заўважаць гэтага «камарынага піску». Бацька паглядзеў на мяне і з ironіяй у голасе спытаў: «Та-ак? А ці ведаеш ты, што ўчастковым выбарчым камісіям устанаўліваюць працэнт зверху — колькі можа быць бюлетэняў «супраць»? Калі гэты працэнт перавышае некалькі дзясятых, дык старшыню камісіі потым выклікаюць у райкам партыі ці яшчэ вышэй і там даюць дыхты. Дробязь, канечне, але прыемна ўсведамляць, што гэта яны нас, выбарцаў, асабліва тых, хто галасуе супраць, баяцца, а не мы іх».

Чаму ўспомніў пра гэта цяпер? Таму што зараз шмат чую размоваў пра байкот. Маўляў, улады падсоўваюць нам шмат кандыдатаў — але не для таго, каб можна было скарыстацца правам выбару, а для таго, каб падмануць выбарцаў. Вынік жа загадзя вядомы — як гэта было 35 гадоў таму ў Савецкім Саюзе. Чаго я пайду галасаваць? Выбару ж ізноў няма. Лепей схавацца за байкот. Усё адно ніхто не даведаецца пра мой удзел ці няўдзел. Затое сам для сябе буду ведаць — я здзейсніў мужны ўчынак.

Байкот выбараў у сучасных умовах нагадвае савецкую кінакамедыю «Аперацыя Ы»... Чаму «Ы»? А каб ніхто не здагадаўся.

# Мілінкевіч: «Я адмаўляю ідэю, што любы пасля Лукашэнкі будзе лепшы за яго»

Уладзімір Някляеў кажа, што ён за інтэграцыю з Расіяй і за партнёрства з Еўропай. Я кажу, што я за партнёрства з Расіяй і за інтэграцыю з Еўропай.



Гэта велізарная розніца, гэта выбар шляху развіцця.

Пасля інтэграцыі з Расіяй шанец на еўраінтэграцыю, на жыццё па еўрапейскіх стандартах, робіцца для нас недасягальна далёкім. Вяртацца ў еўрапейскую сям'ю праз Маскву не ўдасца.

Тое, што сёння Расія спрабуе замяніць Лукашэнку на іншага чалавека, — гэта яшчэ не значыць, што мы стратэгічна можам мець аднолькавыя інтарэсы.

Я катэгарычна адмаўляю ідэю, што любы пасля Лукашэнкі будзе лепшы за яго.

Калі прыйдзе чалавек, які будзе абавязаны здаць беларускую эканоміку, прыватызаваць яе на карысць адной дзяржавы, то гэты чалавек будзе горшы за Лукашэнку.

Я цвёрды апанент існуючага рэжыму. Я хачу жыць у незалежнай краіне, у дэмакратыі і свабодзе, але я не жадаю страціць шанец на вяртанне ў еўрапейскую сям'ю. І вось тут існуе няпростая дылема. Не збіраюся аб'ядноўвацца вакол улады, але я бачу, што ёсць моманты, дзе можна супрацоўнічаць з уладай дзеля захавання незалежнасці і еўрапейскага выбару, увесь час адстойваючы нашы нацыянальныя інтарэсы.

— Вы кажаце: «Калі прыйдзе чалавек, які будзе абавязаны здаць беларускую эканоміку, прыватызаваць яе на карысць адной дзяржавы, то гэты чалавек будзе горшы за Лукашэнку». Вы бачыце такіх людзей сярод сённяшніх кандыдатаў?

Мілінкевіч: Людзей, якія б жадалі гэта зрабіць, напэўна, няма. Але людзей, якія, прыйшоўшы да ўлады, будуць вымушаныя гэта рабіць, я бачу.

Калі будзе холадна і галадна, калі будзе вялікі крызіс, рашэнні аб нашым лёсе могуць прымацца не ў Беларусі.

**Віталь Цыганкоў, «Свободные новости плюс»**

## Станцыі трэцяй лініі метро — прапануйце свае назвы

Дырэктар «Мінскметрапраекта» Валерый Чаканаў заявіў, што праз сем гадоў у беларускай сталіцы збудуюць трэцюю лінію метро **(старонка 4)**.

На ёй запланавана адкрыццё шасці станцый: «Лошыцкая», «Аэрадромная», «Жукоўская», «Вакзальная», «Клары Цэткін», «Юбілейная».

Відавочна, што да справы назвы станцый падышлі ўтылітарна — па назве навакольных вуліц.

Ёсць мікраraён «Лошыца», значыць быць і такой станцыі метро. Аднак назвы «Аэрадромная», «Жукоўская», «Клары Цэткін» адразу выклікалі пярэчанні ў інтэрнэце.

Улічваючы, што да ўвядзення першых станцый трэцяй лініі застаецца шмат часу, прапанаваныя назвы — умоўныя.

А як бы назвалі станцыі трэцяй лініі Вы?

# Пазняк: «Настальгія — страшэнная з'ява. Гэта невыносна!»

Настальгія — гэта першае, з чым трэба навучыцца змагацца на чужыне.



Мне асабліва цяжка было першыя гады, недзе да 2000-га.

Настальгія — страшэнная з'ява. Як цела баліць, мы ўсе ведаем. А гэта боль душы. Гэта невыносна!

Ніякія словы не перакажуць, што гэта такое. Час спыняецца.

Успаміны, галасы, карціны Бацькаўшчыны апаноўваюць тваёй душой і ты не можаш ні пра што іншае думаць, не можаш нічога рабіць...

Дык вось, трэба не дапусціць, каб гэтае мінулае валадарыла над табой, каб гэтыя карціны цябе захоплівалі ў аблогу, каб гэты рай, што застаўся там, не ўзяў цябе ў палон. Бо яго няма. Гэта ілюзія. Гэта проста баленне тваёй душы. Самае небяспечнае, што ў гэтай ілюзіі хочацца быць, існаваць, яна зацягвае, як спевы сірэн, але ў іх — канец.

Мая жонка Галіна хадзіла ў Варшаве на вакзал, каб проста ўбачыць цягнік адтуль.

Гэтага нельга было рабіць. Мне кожны дзень прыходзілася праяўляць сілу волі, каб давесці сабе, пра што нельга думаць і чаго не рабіць! Калі з гэтым не справішся, яно можа знішчыць чалавека.

На настальгію пакутуюць многія, не разумеючы яе прыроды, я назіраў, як некаторых людзей яна ператварыла ў руіны.

— Што дапамагло Вам перамагчы?

— Перш за ўсё, сіла волі. Па-другое, у мяне ёсць шчаслівая магчымасць ездзіць на Віленшчыну, сваю Бацькаўшчыну.

Калі ў 1997 годзе я першы раз прыехаў туды з Амерыкі, адчуў у душы найвялікшае шчасце.

Які гэты пах! На Радзіме пахне па-іншаму! Якое шчасце адчуваць гэта! Бачыць гэту траву, бачыць гэты пыл, гэтае неба...

Бачыце, я нават не кажу ў гэтай сітуацыі пра быт. У эміграцыі вельмі цяжка выжываць.

**Руслан Гарбачоў, «Салідарнасць»**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Дэпутат-лукашэнкавец: Быць Беларусі ўсходам Еўропы ці захадам Азіі?

Уладзімір Здановіч: Еўрапейскія каштоўнасці пагражаюць нашым нацыянальным караням.

«Быць Беларусі ўсходам Еўропы ці захадам Азіі?» — так паставіў пытанне пра будучыню краіны дэпутат палаты прадстаўнікоў ад Драгічына Уладзімір Здановіч.

Прычым не шараговы дэпутат — старшыня парламенцкай камісіі па пытаннях адукацыі, культуры, навукі ды навукова-тэхнічнага прагрэсу. І адказаў на яго арыгінальна: «Пад уздзеяннем еўрапейскіх каштоўнасцяў на першае месца выходзіць прагматызм, жаданне пры найменшых намаганнях атрымаць як мага больш. Гэта [адбываецца] барацьба каштоўнасцяў, якія ёсць у еўрапейскіх краінах і ў Беларусі ды Расеі. Моладзі трэба правільна падказаць, якім шляхам ісці», — сказаў Здановіч. Паводле Здановіча, галоўная задача моладзевай палітыкі Беларусі і Расеі — развіваць саюзную дзяржаву. У Расеі ды Беларусі, лічыць ён, пры



любым дзяржаўным ладзе акцэнт рабіўся на патрыятызме, дзяржаўнасці, фармаванні такіх рысаў асобы, як павага да сваёй краіны, мовы, дзяржавы. «Вонкава прывабная ідэя пабудовы дзяржавы на еўрапейскіх каштоўнасцях хавае ў сабе небяспеку страты нацыянальных каранёў. Гэтага дапусціць мы не мусім», — мяркуе дэпутат.

**Мікола Бугай**

Артыкулы на старонцы «Каментары» могуць супадаць, а могуць і не супадаць з меркаваннем Рэдакцыі.

# Як фальсіфікуюцца выбары

### Сенсацыйныя сведчанні падпалкоўніка міліцыі Мікалая Казлова.

Два гады таму ён зафіксаваў фальсіфікацыі на адным з выбарчых участкаў Мінска. Цяпер жа Казлоў вырашыў расказаць, як гэта было.

Пачатак гісторыі ляжыць у верасні 2008 года, калі адбываліся парламенцкія выбары. Міліцыянт Казлоў ахоўваў парадак на адным з участкаў па Старавіленскай акрузе, дзе балатаваўся Анатоль Лябедзька. Вечарам апошняга дня датэрміновага галасавання да яго падышла старшыня камісіі, якая давяральным тонам сказала, што вечарам ёй патрэбныя ключы ад памяшкання, дзе захоўваецца скрыня, каб правесці туды ўкідванне бюлетэняў.

Падпалкоўнік катэгарычна адмовіўся.

Вось як ён апісвае тую размову:

«З яе тлумачэнняў стала зразумела, што людзей, якія прыйшлі на ўчастак для датэрміновага галасавання, было занадта мала, то бок значна менш, чым меркавалася, і былі асцярогі, што значная іх частка не аддала перавагу «правільнаму» кандыдату.

Мабыць, маё званне падпалкоўніка міліцыі выклікала ў старшыні камісіі давер, і яна вырашыла, што я проста абавязаны быць заадно.

Я аслупянеў ад такой прапановы. Рэакцыя з майго боку была не той, якую яна чакала.

—Пакуль я тут, — сказаў я, — гэта немагчыма. Тое, што вы прапануеце, — гэта злачынства. Вы хочаце яго здзейсніць і прапануеце мне стаць саўдзельнікам. Гэта немагчыма.

Мы гутарылі хвілін сорак. Я спрабаваў пераканаць яе не рабіць гэтага, казаў, што дапускаю: яна пастаўленая ў складаныя ўмовы, але разумны выхад ёсць заўсёды з любой сітуацыі.

—Хай людзі галасуюць так, як лічаць патрэбным. У крайнім выпадку, калі нехта наверсе будзе незадаволены вашай працай, спасылайцеся на мяне. Маўляў, не даў магчымасці...»

Праз нейкі час на мабільнік падпалкоўніка затэлефанаваў непасрэдны начальнік — намеснік начальніка Цэнтральнага РУУС. Казлову параілі не замінаць працы камісіі. Ён аддаў ключы, але паведаміў, што назаўтра зробіць рапарт аб парушэннях на ўчастку.

«—Чаму перашкаджаеце працаваць выбарчай камісіі? — гэта быў адзін з маіх наўпростых начальнікаў — намеснік начальніка Цэнтральнага РУУС. Ён учыніў мне сапраўдны разнос: неадкладна аддайце ключы, рабіце тое, што вам гавораць і г.д.

—Мне вядома, што чальцы выбарчай камісіі маюць намер укінуць бюлетэні ў урны, таму не магу аддаць ім ключы, — я спрабаваў рэагаваць на яго тыраду максімальна спакойна.

—Не ваша справа... Я вам загадваю аддаць ключы. Старшыня камісіі забылася ў пакоі паперы, іх трэба забраць.

Пасля атрымання наўпростага загаду я вымушаны быў падпарадкавацца.

Хвілін праз сем трое (!) чальцоў камісіі зайшлі ў пакой са скрынямі. Праз нейкі час я адкрыў дзверы і ўбачыў, як усе трое стаяць каля скрыні і кідаюць туды бюлетэні. Стос быў даволі важкі.

Я тут жа зноў патэлефанаваў свайму начальніку і заявіў:

—Я дакладаю, што толькі што на маіх вачах быў зроблены ўкід бюлетэняў у скрыні для галасавання.

—Гэта не ваша справа, — адказаў ён.

—Будзем разбірацца заўтра».

Слова сваё ён стрымаў. Казлова выклікаў да сябе начальнік мінскай міліцыі Фармагей. Той прасіў даць публічныя абвяржэнні на тэлебачанні, але ў адказ была адмова. Тым не менш, Казлоў паабяцаў маўчаць, пакуль будзе весціся справа.

Так гэтая справа і сціхла. Цяпер Мікалай Казлоў ужо звольніўся з праваахоўных органаў. Ён бачыць, што справа не расследуецца. Больш за тое, ён заўважаў сачэнне за сабой і даведаўся аб праслухоўванні свайго тэлефона. Таму і даў інтэрв'ю «Народнай волі».



Зміцер Панкавец

У панядзелак Мікалай Казлоў разам са старшынёй АГП Анатолем Лябедзькам даваў прэс-канферэнцыю. Справа ў тым, што два гады назад фальсіфікацыі былі выяўленыя якраз на акрузе, дзе балатаваўся Лябедзька.

«Мы пазнаёміліся 20 хвілін таму. Для мяне гэты чалавек — прыклад мужнасці», — пачаў прэс-канферэнцыю А.Лябедзька.

Лідар АГП нагадаў, што рабіў запыты ў Генеральную пракуратуру адносна фальсіфікацый вынікаў выбараў, пра што публічна заяўлялі Аляксандр Лукашэнка і Канстанцін Сумар. «Адказ быў такі, што альбо гэтыя людзі недзеяздольныя, альбо хлусы», — кажа палітык.

«Мікалай Казлоў сказаў, што фальсіфікацыі былі, але на шкоду альтэрнатыўным кандыдатам. Робім выбар: хто кажа праўду».

Таксама Лябедзька рыхтуе зварот да дэпутата палаты прадстаўнікоў Самасейкі, які быў абраны па Старавіленскай акрузе. Старшыня АГП перакананы, што ў любой краіне парламентар пасля такога скандалу павінен сысці ці хаця б часова скласці з сябе абавязкі.

«Чакаў, што пракуратура будзе праводзіць нейкае следства. Цяпер жа я бачу, што пачынаюцца новыя выбары, але нічога не мяняецца. Застаюцца тыя самыя людзі. Я збіраюся даваць паказанні, калі нехта распачне справу», — кажа М.Казлоў.

Для былога міліцыянта было не вельмі звыкла адказваць на пытанні журналістаў. Сказаў, што прыйшоў на прэс-канферэнцыю, каб ніхто потым не падумаў, што адмаўляецца ад сваіх словаў.

Чаму Казлоў асмеліўся гэта зрабіць? «Ёсць нейкія пытанні, якія больш высокія. Я хачу, каб было справядліва. Мне пазваніла шмат калег, сяброў выказаць падтрымку», — кажа міліцыянт.

Ніякага ціску на сабе ён яшчэ не адчуў. Што датычыць чальцоў участковых камісій, то кажа, што разумее іх.

«Я не збіраўся нікога лавіць за руку. Так выйшла, што я пабачыў гэты ўкід бюлетэняў. Старшыня камісіі баялася, ёй было страшна. Прычым, не мяне, чалавека ў форме, а таго, што не ўкіне гэтых бюлетэняў», — сказаў падпалкоўнік.

Анатоль Лябедзька гаворыць, што яму ўжо патэлефанавала двое старшынь камісій, якія гатовыя ў будучыні таксама агучыць факты фальсіфікацый. «Проста некаму трэба пачаць», — кажа старшыня АГП.

Мікалай Казлоў лічыць, што гэтую справу можна хутка расследаваць, калі б у гэтым была зацікаўленасць праваахоўных органаў.

«У міліцыі розныя людзі. У тым ліку і прыстойныя. Шкада, што апошнія пачалі звальняцца са службы. Мне будзе проста, бо я не хлушу», — сказаў міліцыянт.

Гэта толькі адзінкавы прыклад. Учынак Мікалая Казлова варты захаплення. Напэўна, такіх, як ён, што становяцца сведкамі фальсіфікацый на выбарах, нават не дзясяткі. Тым не менш, мужнасці агучыць хапае толькі ў адзінак, калі не ў аднаго.

**Зміцер Панкавец**

## Лазавік пра сведчанні падпалкоўніка Казлова: «Не чытаў, не ведаю»

### — і развітаўся.

Мікалай Лазавік адказаў журналістам «Нашай Нівы», што не чытаў новы нумар «Народнай волі» і не ведае, пра які артыкул ідзе гаворка. На пытанне, ці ведае сакратар Цэнтравыбаркама пра той факт, які апісвае падпалкоўнік міліцыі, што можа сказаць пра разбіральніцтва па факце парушэння закона падчас парламенцкіх выбараў 2008 года, Лазавік, не даслухаўшы, на якім канкрэтна ўчастку ўкідвалі бюлетэні, адказаў:

«Я не магу каментаваць таго, чаго я не ведаю», — і развітаўся.

У Цэнтральным РУУС пра артыкул у «Народнай волі» нічога не ведаюць, інфармацыі наконт разбіральніцтва па факце фальсіфікацыі 27 верасня 2008 года на выбарчым участку № 463 без афіцыйнага запыту не даюць.

**Настасся Шамрэй**




**Лідзія Ярмошына заявіла, што «Белтэлерадыёкампанія больш упэўнена сябе адчувае, калі дэбаты паказваюць у запісе». Апазіцыя дабіваецца, каб тэледэбаты ішлі не ў запісе, а ў жывым эфіры.**

PHOTO.BYMEDIA.NET

## Апазіцыя гатова начаваць каля ўчасткаў

### 250 участкаў маюць ахапіць кругласуткавым назіраннем.

Кампанія «За справядлівыя выбары», якую праводзяць больш за дзесяць дэмакратычных партый і аб'яднанняў, мае намер ахапіць 250 участкаў для галасавання кругласутачным назіраннем.

Цікава, што ўзначалілі кампанію палітыкі з розных лагераў апазіцыі – посткамуніст Сяргей Калякін і Віктар Карняенка з нацыянальна-ліберальнага Руху «За Свабоду».

Віктар Карняенка кажа, што на кожны з такіх участкаў плануецца накіраваць па чатыры назіральнікі. «Калі спатрэбіцца, то мы гатовы начаваць пад дрэвамі выбарчых участкаў», — паведаміў палітык.

Усяго кампанія «За справядлівыя выбары» мае намер накіраваць да 1600 назіральнікаў на ўчасткі для галасавання, а таксама вылучыць больш за тысячу сваіх прадстаўнікоў у склад участковых выбарчых камісій.

«Гэтага дастаткова, каб зрабіць добры аналіз працэсу галасавання і падліку галасоў», — сказаў Карняенка.

З такой ініцыятывай апазіцыя выступае ці не ўпершыню. Раней за мэту ставілася амбіцыйная задача назірання за выбарамі па ўсёй краіне, хоць рэсурсу на гэта і не хапала.

Прынята лічыць, што найбольш фальсіфікацый адбываецца ў час датэрміновага галасавання.

«Канечне, мала ўчасткаў збіраемся кантраляваць. Далучайцеся, і тады зможам больш, — напісаў Віктар Карняенка ў каментарах на сайце «НН». — Задача — не дапусціць фальсіфікацый хаця б на некаторых участках і зафіксаваць розніцу паміж «назіранымі» і іншымі ўчасткамі». Карняенка таксама кажа, што назіральнікі будуць мець задачу адсочваць падлік галасоў і адпаведнасць запісу ў пратаколы.

**ЗП**

## Пазняк раскрытыкаваў усіх

### Усе гэтыя людзі ведаюць, што яны не перамогуць.

«Ніхто з кандыдатаў не адмовіцца і не гатовы адмовіцца ад удзелу ў рэжымных выбарах дзеля барацьбы з рэжымам. (У дужках зазначу, акрамя хіба што Някляева, але ў адзіночку рабіць такое няма сэнсу і для спаборніка будзе фатальна шкодным.)

Усе гэтыя людзі, якія ідуць кандыдатамі на выбары, ведаюць, што яны ў прынцыпе не перамогуць. Яны цудоўна разумеюць, што такое фальсіфікацыйная машына рэжымнага галасавання. Яны голасна пра гэта кажуць, але ўсё роўна ідуць на выбары і няшчыра ўсклікаюць на публіку, што перамогуць. (Адзначу, ізноў — акрамя Някляева, які, відаць, сапраўды думае і верыць, што пераможа.)

На месца Мілінкевіча ўжо два гады мэтанакіравана і паслядоўна рыхтуе сябе Саннікаў. Гэта найбольш прарасійскі спаборнік і найбольш палітычна выраблены. Пазіцыя проста ганебная. Але такая ў яго тактыка: казаць можна, што хочаш, адказваць за словы не прыйдзецца, бо на прэзідэнта не выберуць, а Маскве прыемна».

**ЗП**

# Трыццаць сцягоў на праспекце

Кандыдат ад БНФ правёў мега-пікет «Праспект нацыянальнага сцяга».



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Партыя БНФ і Хрысціянская дэмакратыя (БХД) выставілі шматлікія пікеты ў падтрымку сваіх кандыдатаў на праспекце Незалежнасці каля плошчы Перамогі. У выніку кавалак галоўнай магістралі сталіцы на гадзіну стаў бел-чырвона-белым.

Да акцыі арганізатары запрасілі далучыцца ўсіх ахвотных, але скарысталася запрашэннем адна БХД. «Рыгор Кастусёў запрасіў нас паўдзельнічаць у гэтай цудоўнай акцыі. Мы пагадзіліся, мы шануем нашы нацыянальныя сімвалы», — зазначыў сустаршыня БХД і адначасова патэнцыйны кандыдат у прэзідэнты ад гэтай партыі Віталь Рымашэўскі.

Сам Рыгор Кастусёў так патлумачыў сэнс вывешвання сцягоў: «Вось бачыце, як пазітыўна людзі ўспрымаюць нас. Аўтамабілісты нас вітаюць сігналамі. Гэта цудоўна. Беларускія сілы жывыя, і жыве наш харошы сцяг».

Штаб Кастусёва разглядае магчымасць правядзення іншых такіх акцый у сталіцы і рэгіёнах, аднак пакуль рашэнне пра іх не прынята.

Рыгор Кастусёў таксама адкаментаваў інтэрв'ю Алеся Міхалевіча, у якім той заявіў, што пытанне нацыянальнай сімволікі не прыярытэтнае, а чырвона-зялёны сцяг для яго не чужы, бо пад ім «перамагалі беларускія спартсмены»: «Думаю, гэта проста нейкая памылка. Праз нявопытнасць».

«Праспект нацыянальнага сцяга» аўтамабілістам спадабаўся. Пікетоўшчыкаў віталі гудкамі.

Міліцыянты (у форме і без) у падзеі не ўмешваліся. Старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына ў нядзельным эфіры БТ назвала мега-пікет «парушэннем», але гатовая «заплюшчыць на яго вочы».

Першапачаткова мега-пікет планавалася правесці ў больш шырокім маштабе — ад скрыжавання з вуліцай Казлова да плошчы Якуба Коласа. Аднак сабраць дастатковую колькасць пікетоўцаў не ўдалося.

Пад бел-чырвона-белымі сцягамі збіраюць подпісы два кандыдаты: Рыгор Кастусёў і Віталь Рымашэўскі.

**Алесь Пілецкі**

# У цэнтры Мінска паўсталі палаткі

Апазіцыя скарыстоўвае адлігу для агітацыі.

«Нідзе не зафіксавана, што гэтага нельга рабіць — збіраць подпісы зраніцы, удзень, увечары, уначы. А што не забаронена, тое дазволена. Таму мы вырашылі паставіць намёт», — сказаў лідар кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў.

Выпадкова альбо не, але за некалькі хвілін да пачатку акцыі ля перадвыбарчай палаткі прайшоў міністр унутраных спраў Беларусі Анатоль Куляшоў. Кажуць, ён аматар прагулянца пешкі па цэнтры сталіцы.

У штабе Някляева кажуць, што намёт «будзе стаяць столькі, колькі будзе трэба», а таксама адзначаюць яго сімвалічнасць. Адну ноч у ім правёў нават кіраўнік штаба Някляева Андрэй Дзмітрыеў. «Для нас гэта не толькі піяркрок, але і нешта важнейшае», — зазначыў ён.

«Калі іншыя кандыдаты вырашаць далучыцца, то мы гатовы дапамагчы намётамі», — дадае Някляеў. Рэсурсаў гэтая кампанія мае досыць. 15 кастрычніка актывісты «Гавары праўду!» нават кармілі канкурэнтаў абедам. Тамсама, у наваяўленым цэнтры палітычнага жыцця краіны. У меню ўваходзілі юшка і бутэрброды з чырвонай ікрой.

Пачаставаць удалося прыхільнікаў Андрэя Саннікава і Яраслава Раманчука. Прадстаўнікоў іншых патэнцыйных кандыдатаў ля ГУМа не было, а сябры ініцыятыўнай групы Лукашэнкі ад смакоцця адмовіліся. «Дзякуй, дзякуй. Мы не галодныя. Мы булачкі ў ГУМе набылі. Мы «Макдональдс» любім», — запэўнівалі жанчыны.

Намёт стаіць ля ГУМа дагэтуль. Праўда, іншыя кандыдаты да ініцыятывы Някляева не далучыліся. Толькі каманда Андрэя Саннікава прыносіць палаткі на вялікія пікеты, каб зборшчыкі подпісаў маглі схавацца ад сівернага ветру. Але прыносіць толькі на дзень, а на ноч прыбірае.

**АП**

# Казулін: Зняцца ўсім апазіцыянерам было б моцным рашэннем

Былы палітвязень і кандыдат на пасаду прэзідэнта Аляксандр Казулін адказаў на некалькі пытанняў «Нашай Нівы».

**«Наша Ніва»: Каго падтрымліваеце на гэтых выбарах?**

**Аляксандр Казулін:** Ёсць добрыя кандыдаты, якіх можна падтрымаць. Іх прозвішчы відавочныя. Гэта людзі, якія маюць прафесійны вопыт, добрыя спецыялісты.

**«НН»: Саннікава маеце на ўвазе?**

**АК:** І Саннікава, і іншых. Пытанне не ў тым, каб кагосьці падтрымліваць персанальна. Важна падтрымліваць вынікі. А вынікаў няма ні ў каго з кандыдатаў.

**«НН»: А які ў Вас прагноз на развіццё паслявыбарчых падзей?**

**АК:** Можа быць абсалютна рознае. Але шанцаў, што Лукашэнка сыдзе, няма ніякіх. Ён яшчэ застанецца.

**«НН»: Дык тады апазіцыянерам, можа, варта было б зняцца з выбараў?**

**АК:** Калі ўсе між сабой дамовяцца, то гэта было б моцным рашэннем.

**«НН»: Дык можна чакаць Вашага з'яўлення ў камандзе аднаго з кандыдатаў?**

**АК:** Я не магу браць удзел у тым, што не прыносіць вынікаў.

**«НН»: А як у Вас справы? Былі чуткі, што нібыта Вы эміграваллі з краіны?**

**АК:** У мяне ўсё добра. Я не для таго праз столькі прайшоў, каб з'язджаць.

**Гутарыў ЗП**

## Сцісла

**• Прэтэндэнт у прэзідэнты Рыжоў: Скажам Лукашэнку «Дзякуй».** Начальнік сектара замежнаэканамічнай дзейнасці ААТ «Віцебскі плодаагароднінны камбінат» Сяргей Рыжоў ганарыцца «такімі момантамі і дасягненнямі ў развіцці краіны, як небывалае развіццё медыцыны, будаўніцтва дамоў і гарадоў, няхай у мінімальным плане, але распаўсюджванне сацыяльных стандартаў, аднаўленне архітэктурных помнікаў, развіццё спорту і турызму». Аднак ён прапануе вызваліць усіх палітвязняў і людзей, што першы раз за кратамі.

**• Кандыдат Правальскі сабраў 60 тысяч подпісаў на Віцебшчыне.** Своеасаблівы рэкорд выбарчай кампаніі паставіў кандыдат у прэзідэнты, прадпрымальнік з Віцебска Уладзімір Правальскі. Усе свае подпісы — а гэта больш за 60 тысяч — ён сабраў на тэрыторыі адной Віцебскай вобласці. За межамі вобласці Правальскі не збірае, адмовіўся ад такіх планаў. Правальскі стаў вядомы тым, што на пасяджэнні ЦВК запатрабаваў не рэгістраваць кандыдатуру Аляксандра Лукашэнкі, бо той не мае права балатавацца на гэтых выбарах.

**ЗП**

# Міхалевіч спрабуе пазіцыянавацца ў незвычайнай нішы

Ён прапануе змену курсу без ломкі сістэмы.

Алесь Міхалевіч у выпадку абрання прэзідэнтам найперш збіраецца вызначыць статус былога прэзідэнта, а пасля заняцца эканомікай. Пра гэта ён заявіў у інтэрв'ю агенцтву «Інтэрфакс-Захад».

На пытанне, ці верне ён «Пагоню» і бел-чырвона-белы сцяг, Міхалевіч заявіў, што не будзе займацца такімі рэчамі, што гэта мае вырашыць парламент. «Але я не маю варожага стаўлення да сённяшніх дзяржаўных сімвалаў. Пад імі перамагалі многія беларускія спартоўцы», — удакладніў ён.

Нечаканыя прыярытэты былі акрэслены і ў замежнай палітыцы. «Уступленне ў Еўрасаюз — не мэта», — мяркуе Міхалевіч.

Алесь Міхалевіч пачынаў сваю палітычную кар'еру ў якасці лідара Задзіночання беларускіх студэнтаў і ў Партыі БНФ. Ён беларускамоўны ў паўсядзённым жыцці.

Цяпер жа ён спрабуе пазіцыянавацца ў незвычайнай нішы: адкінуць старыя фетышы і зачапіцца за сацыяльныя тэмы, актуальныя для моладзі і сярэдняга слоя. Аднак палітык рызыкуе страціць традыцыйную нацыянал-дэмакратычную базу. Ягоная гутарка на «Інтэрфаксе» выклікала вялікае абмеркаванне ў інтэрнэце. Ягоныя выказванні многімі трактаваліся як адыход ад нацыянальных пазіцый.

«Зразумела, што я прызнаю «Пагоню» і бел-чырвона-белы сцяг як нацыянальныя сімвалы, — патлумачыў кандыдат Міхалевіч «Нашай Ніве». — Я вырас з гэтым сцягам і гербам. Маё меркаванне, што гэтым пытаннем не павінен займацца прэзідэнт. Яго будзе абмяркоўваць парламент. Нам трэба звыкаць, што кіраўнік дзяржавы мае выканаўчую функцыю. Для мяне важна данесці людзям, што я прапаную паляпшэнне ўзроўню жыцця без ломкі сістэмы, якая, трэба прызнаць, ім падабаецца».



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Тым самым ён абгрунтоўвае неабходнасць вызначэння статусу былога прэзідэнта. «Гэта найперш датычыць не гарантый, а прававога становішча. Якім яно будзе — залежыць ад сітуацыі. У нас ніколі не было былых прэзідэнтаў, таму і статус іхні ўсё яшчэ не вызначаны».

«Ці праўда, што Міхалевіч прэтэндуе на ролю новага Гайдукевіча?» — запыталіся мы.

«Спакойна стаўлюся да навешвання ярлыкоў, — адказаў Міхалевіч. — Калі я кажу, што ў мае прыярытэты не ўваходзіць уступленне ў Еўрасаюз, то гэта не значыць, што я гэтага не хачу. Гэта азначае, што на дадзеным этапе зрабіць гэта нерэалістычна, таму гэтага і няма ў прыярытэтах».

«Алесь, ты не называеш сябе ўжо апазіцыяй?» — спыталіся мы.

«Не, — пацвердзіў ён. — Я не прадстаўляю ні ўладу, ні апазіцыю. Як, дарэчы, і не крытыкую. Я за мадэрнізацыю без ломкі сістэмы».

**Мікола Бугай, Зміцер Панкавец**

**Алесь Міхалевіч**

нар. у 1975. Ён з сям'і навукоўцаў. Скончыў БДУ па спецыяльнасці паліталогія. Узначальваў Задзіночанне беларускіх студэнтаў, доўгі час уваходзіў у Партыю БНФ. Быў дэпутатам Пухавіцкага райсавета. Жанаты, мае дзвюх дачок.

# Частка XII. Змаганне Рагнеды

Піша **Алег Дзярновіч**.

Працяг. Пачатак у №26, 28, 30, 39, 47 за 2009 год, №7, 22, 27, 29, 32, 34 за 2010 год.

## Ліквідацыя канкурэнта

Прасоўваючыся з Ноўгарада на поўдзень ды пашыраючы сваю ўладу, князь Уладзімір разлічваў у змаганні за Кіеў заручыцца падтрымкаю Полацка і яго князя Рагвалода, што кантраляваў альтэрнатыўны Дзвінскі гандлёвы шлях. Палітычныя саюзы ў той час афармляліся праз дынастычныя шлюбы. І Уладзімір пасватаўся да дачкі полацкага ўладара Рагвалода, князёўны Рагнеды, якая была ўжо абяцаная ў жонкі кіеўскаму князю Яраполку.

Менавіта ў аповедзе пра сватанне Уладзіміра і сканцэнтравалася логіка далейшых драматычных падзей. Паводле «Аповесці мінулых гадоў», на пытанне бацькі, ці хоча яна выйсці за наўгародскага князя, Рагнеда адказала: «Не хачу разуці рабыніча, але Яраполка хачу». Паводле архаічнага індаеўрапейскага, зафіксаванага таксама ў ахейскіх грэкаў, звычаю, маладая жонка здымала абутак і абмывала ногі свайму мужу. Сваёй адмовай Рагнеда адмаўлялася гэтак рабіць Уладзіміру як «рабынічу» — сыну рабыні. У чым тут праўда?

Летапісы, у якіх утрымліваецца інфармацыя пра паходжанне Уладзіміра, сапраўды сцвярджаюць, што маткаю князя была Малуша — ключніца вялікай княгіні Вольгі, бабкі Уладзіміра. Малуша стала наложніцай сына Вольгі — вялікага князя Святаслава. Але гэтак адбылося без згоды самой Вольгі, таму цяжарную Малушу яна саслала ў сяло Будуцыне пад Псковам (магчыма, сучасная вёска Буднік). Адносна сацыяльнага статусу Малушы да канца няма пэўнасці, але Рагнеда лічыла яго вельмі нізкім, што і выказала ў сваёй ганарлівай адмове.

Але Уладзімір у княскім родзе не лічыўся незаконнанароджаным. Шматжонства было ў звычаі, сацыяльнае паходжанне вызначалася па бацьку, і дынастычныя правы не прыніжаліся, пра што сведчыць і выразна княскае імя Уладзіміра.

Як сведчаць далейшыя летапісныя паведамленні, энергічны Уладзімір, адчуўшы, што не ўдасца прыцягнуць на свой бок Полацк, вырашыў, прынамсі, перадухіліць яго хаўрус з Яраполкам. Уладзімір хутка сабраў з варагаў, славенаў, чудзі і пскоўскіх крывічоў дружыну ды выправіўся ў паход. Падобна, што Рагвалод не чакаў такога раптоўнага з'яўлення Уладзіміра пад сценамі Полацка, што шмат у чым і прадвызначыла вынікі гэтай хуткаплыннай вайны. Ваяводы ж Яраполка Кіеўскага спазняліся да Полацка. Горад быў узяты вясною 980 г. (паводле іншых звестак — 978 г.).

Рагвалод трапіў у палон разам з сям'ёй і на загад Уладзіміра быў забіты разам з жонкай і двума сынамі. Рагнеду ж Уладзімір прымусам узяў сабе за жонку.

## Помслівы Дабрыня

Але гэта не ўся інтрыга. Братам Малушы і, гэта значыць, дзядзькам князя Уладзіміра быў Дабрыня. Праўдападобна, менавіта ён і займаўся выхаваннем Уладзіміра, бо ў дружынных звычаях было давяраць дагляд за сталеннем спадкаемца членам старшай дружыны. Верагодным годам нараджэння Уладзіміра называюць 960 г. І калі Святаслаў у 970 г. раздаваў свае ўдзелы сынам, то ў Ноўгарад Уладзімір накіраваўся разам з Дабрыням, які фактычна быў рэгентам пры князю-падлетку. У далейшым Дабрыню называюць ваяводам Уладзіміра.

Далей — Дабрыня таксама займаўся справай сватання Уладзіміра і зняважлівы адказ Рагнеды быў выклікам і для самога Дабрыні. Ён жа ўзначаліў карную аперацыю супраць Полацка. І, як сведчаць летапісы, менавіта на запатрабаванне Дабрыні Уладзімір згвалціў Рагнеду паводле архаічнага рытуала — у прысутнасці яшчэ жывых бацькоў: «бысць з ней [Рагнедай] перад бацькам яе і маці». Гэтым самым сімвалічна абвяшчалася авалоданне Полацкам і паганьбаванне ўсяго роду.

Застаецца дадаць, што фальклярысты разглядаюць ваяводу Дабрыню як прататыпа быліннага волата Дабрыні Нікіціча, другога па папулярнасці пасля Ільі Мурамца героя эпасу Кіеўскай Русі. Зрэшты, у рускім фальклоры Дабрыня Нікіціч таксама не заўжды выглядае прывабна — ён гіне ад рукі баярына Пярмяты, жонку якога, Кацярыну Цудоўную, волат Дабрыня спакусіў.

З Полацка Уладзімір і Дабрыня рушылі непасрэдна на Кіеў і ў далейшай барацьбе змаглі перамагчы Яраполка. Уся Руская зямля дасталася амбітнаму князю Уладзіміру, які дзеля ажыццяўлення сваёй мэты не шкадаваў жыцця крэўных. Зрэшты, яны яму адказвалі тым жа.

Полацкая ж зямля, пазбаўленая ўласнага князя, трапіла пад уладу князя Кіеўскага. Паводле Пачатковага летапісу, Уладзімір пасяліў Рагнеду, якая атрымала новае імя Гарыслава, каля Кіева на рацэ Лыбедзь.

Відавочна, што ўсе дзеянні Уладзіміра і яго ваяводы, апісаныя ў гэтых эпізодах, мелі рытуальны характар. Забойства правадыра роду ў пэўным сэнсе «знішчае» ўвесь род у цэлым. Змена ж імя яшчэ раз сімвалізуе знішчэнне роду і заклікана сцерці саму памяць аб ім, тым больш што скандынаўскае імя Рагнеда пэўным чынам суадносіцца са скандынаўскім імем яе бацькі — Рагвалод. Падобны прынцып алітэрацыі (паўтор аднолькавых зычных гукаў з мэтаю ўзмацнення мастацкай выразнасці мовы) родавага імя быў пашыраны ў германцаў.

## Рагнеда як Брунгільда

У Кіеве было спраўлена яго вяселле з Рагнедай, другой ужо жонкай Уладзіміра. Плануючы з палітычных мэтаў прыняць хрысціянства і ажаніцца з візантыйскай прынцэсай Ганнай, недзе перад 986 г. Уладзімір мусіў развесціся з усімі сваімі паганскімі жонкамі, у тым ліку з Рагнедаю. Верагодна, менавіта да гэтага часу (985—986 гг.) трэба аднесці і замах Рагнеды на Уладзіміра.

Паводле легенды, Уладзімір прыехаў аднойчы ў сяльцо на Лыбедзі, дзе жыла Рагнеда. Уначы, калі князь спаў, Рагнеда хацела закалоць яго, але Уладзімір прачнуўся і паспеў адвесці ўдар. Спроба Рагнеды забіць мужа разглядаецца некаторымі даследчыкамі як праяўленне рэўнасці, але многімі — як помста забойцу яе бацькоў і роду. Уладзімір цудам пазбег смерці і адразу хацеў пакараць Рагнеду смерцю, але за маці ўступіўся іх сын Ізяслаў. Тады Уладзімір саслаў жонку і сына ў Ізяслаўль.




**Замах Рагнеды на Уладзіміра. Мініятура Радзівілаўскага летапісу (XV ст.).**

Расійскі даследчык Б.Сакалоў сфармуляваў гіпотэзу аб запазычанні са старажытнанямецкага эпасу сюжэта пра Рагнеду і пра яе падабенства да тыпу «жанчыны-волата», Брунгільды Усходняй Еўропы. Далёка не ўсе даследчыкі з гэтай версіяй згодныя, але, як Алена Рыдзеўская, прапануюць яшчэ адну верагодную крыніцу запазычання сюжэта — ісландскія сагі.

У Ynglinga saga распавядаецца пра сватанне аднаго нарвежскага конунга да дачкі іншага, якую звалі Асай. Атрымаўшы адмову, конунг ідзе вайной; у баі гінуць бацькі і брат Асы, а яе самую пераможца бярэ сабе за жонку. Але праз два гады гіне ад рукі забойцы, падасланага Асай. У Асы, як і ў Рагнеды, ёсць сын ад мужа-захопніка. Помста, як бачым, адбываецца не адразу. Аналагічна таму, як Рагнеда пасля разрыву з Уладзімірам атрымлівае сваю «отчыну» з Ізяславам, Аса пасля смерці мужа сыходзіць у тое ж княства, якім валодаў яе бацька, і там выхоўваецца яе сын.

У сазе пра Олава, сына Тругві, прысутнічае эпізод пакушэння жонкі на мужа: «У першую ноч, калі яны ляжалі разам, як толькі конунг заснуў, яна замахнулася [на яго] нажом і хацела нанесці яму ўдар. І калі конунг гэта заўважыў, ён забраў у яе нож і падняўся з пасцелі, і пайшоў да мужоў сваіх і кажа, што здарылася».

Легенда пра Рагнеду, яркая і цэльная, перагукаецца з паўночнымі сагамі. Вобраз дачкі Рагвалода, якая помсціць за сваіх кроўных, глыбока роднасны гераіням саг і «Эды» — асноўнага твора германа-скандынаўскай міфалогіі. У скандынаўскім грамадстве эпохі вікінгаў яшчэ захоўвалі сваю моц адносіны і паняцці, якія перайшлі ў спадчыну ад родавага ладу, і ў гэтым грамадстве жанчына займала высокае і ганаровае месца. З ідэалогіяй скандынаваў гэтай эпохі можна звязваць і сцэну з Ізяславам, калі маленькі княжыч, абараняючы Рагнеду, выступае з мячом у руках супраць свайго бацькі Уладзіміра Святаславіча. Аналагаў у рускім фальклоры і рускіх літаратурных помніках гэтаму сюжэту не знойдзена. Адзінае, з чым можна зблізіць сцэну з Ізяславам паводле яе унутранага зместу, — з неаднаразова праяўленым у паўночных сагах поглядзе на сына як на члена рода маці (а не толькі бацькі), як на магчымага заступніка за яе, які помсціць за родзічаў маці нават уласнаму бацьку. Калі прыняць падобны пункт гледжання, то Рагнеда выступае перад намі не толькі як энергічная і цэльная жаночая індывідуальнасць, але як прадстаўніца выразнай ідэалогіі, што асноўваецца на родавых адносінах.



**Дабрыня Нікіціч. Фрагмент карціны Віктара Васняцова «Волаты» (1898 г.)**

## Наступ патрыярхату

У паданні пра Рагнеду сышліся два звычаі: архаічны індаеўрапейскі, які прадугледжваў працяг роду і па лініі маці, а таксама больш новы, патрыярхальны, які звязваў правы роду з бацькам, што было вельмі важным для дынастычнай традыцыі. Апошняя тэндэнцыя ўсё больш пашыралася сярод славянамоўных супольнасцяў Усходняй Еўропы.

Такім чынам, усё, што адбылося з Рагнедай, было запісана летапісцамі з выкарыстаннем пэўнай міфалагічнай матрыцы. Яшчэ Мітрафан Доўнар-Запольскі заўважыў, што паданне пра Рагнеду магло нарадзіцца з дружыннага эпасу ў Кіеве ўжо ў XII ст., як вытлумачэнне таго, чаму Полацк змагаецца супраць Кіева.

Але ж далёка не ўсе звесткі ў паданні пра Рагнеду міфалагізаваныя. Рэальна існавала сяльцо Прадславіна на беразе Лыбедзі, куды была сасланая полацкая князёўна. Дакладным фактам з падання ёсць таксама існаванне замка Ізяслаўля, куды ў канцы X ст. маглі быць сасланыя Рагнеда са сваім сынам, і з якога потым вырасце Заслаўе. Сапраўднымі трэба прызнаць і вяртанне Рагнеды з Ізяславам у Полацкую зямлю ды кантынуацыю тым самым мясцовай дынастыі.

# Неюбілейныя нататкі ў гонар школьнага юбілею

15 кастрычніка адзначыў юбілей Рэспубліканскі музычны каледж пры Беларускай акадэміі музыкі. Піша **Юлія Андрэева**.

75 гадоў таму выйшла пастанова Саўнаркама БССР «Аб адкрыцці аддзялення юных талентаў пры Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі», з якой афіцыйна і пачалася гісторыя каледжа. Слаўны дакумент, высечаны не ў мармуры, а ўсяго толькі ў дрэве, красуецца на парадняй лесвіцы, каб гаспадары і госці памяталі, што гісторыя жывая і свежая, і да яе трэба ставіцца з павагай.

Прозвішча аўтара пастановы на табліцы не згадваецца. Аднак з дапамогай Google можна знайсці амаль усё. Мацей Галенда (1894—1936), у 1930—1935 гг. — старшыня Дзяржплана, намеснік старшыні СНК БССР. 12 студзеня 1935 выключаны з партыі. 19 студзеня 1935 арыштаваны. 4 лістапада 1936 расстраляны. 26 красавіка 1991 рэабілітаваны.

Не часта згадваюць і імя першага, легендарнага дырэктара музычнага каледжа Ізраіля Германа, хаця рэпрэсаваны ён не быў. У самыя цяжкія гады ён здолеў захаваць школу і ператварыць яе ва ўнікальную навучальную ўстанову ва ўмовах БССР. Герман працаваў дырэктарам амаль 40 гадоў.

А пачыналася ўсё са сціплых дзіцячых класаў у будынку кансерваторыі (былога Гарадскога тэатра, на месцы якога цяпер гатэль «Еўропа»). Трыццаць чалавек навучалася па дзвюх спецыяльнасцях: скрыпка і фартэпіяна. Затое настаўнікамі былі легендарныя прафесары кансерваторыі: піяністы Аляксей Клумаў, Міхаіл Бергер, Рыгор Шаршэўскі, Георгій Пятроў, скрыпачы Аркадзь Бяссмертны, Аляксандр Амітон. Крыху пазней да іх дадаўся віяланчэліст Аляксандр Стагорскі. Сярод першых вучняў школы былі вядомыя прафесары Беларускай кансерваторыі Ірына Цвятаева і Валянціна Рахленка, народныя артысты БССР скрыпачы Георгій Клачко і Сямён Асновіч.

У 1947 годзе дзіцячае аддзяленне кансерваторыі атрымала статус Рэспубліканскай музычнай школы-дзесяцігодкі пры Белдзяржкансерваторыі і ўсялілася ў адзін з найлепшых будынкаў горада — былы губернатарскі дом на плошчы Свабоды. Дапамагла хітрая палітыка Германа. Частка месцаў у школе аддавалася дзецям «важных людзей». Яны лёгка пераадольвалі конкурс у дваццаць чалавек на месца. Для іх існавалі «палегчаныя» групы па сальфеджыа і гнуткія праграмы па спецыяльнасці. З часам усё само наладжвалася: каму музыка была непатрэбная, сыходзілі, тыя ж, хто музыку любіў, рабіліся прафесіяналамі. Музыка ўносіла рысы высакароднасці і ў сечаныя твары беларускай наменклатуры.

Ад 1930-х у школе існавала сістэма пошуку талентаў. Настаўнікі праслухоўвалі сотні дзяцей у дзіцячых дамах, садках і школах. Здаралася, сіроты ці дзеці з бедных сем'яў гадамі жылі на поўным утрыманні ў доме настаўніка. Адзінае, што лічылася, — гэта талент.

Асабліва клапаціўся Герман пра тое, каб у дзяцей былі найлепшыя настаўнікі. І не толькі па спецыяльнасці, але і па агульнаадукацыйных прадметах. Я гэта памятаю, таму што правучылася ў ССМШ адзінаццаць гадоў — з 1967 па 1978 год.

Успамінаю нашу настаўніцу матэматыкі Валянціну Грахоўскую, жонку рэпрэсаванага паэта. Прыгожая і высакародная жанчына, яна ўмела расказаць тэарэму па геаметрыі так, што клас слухаў разявіўшы раты. Бліскуча выкладалася расійская мова і літаратура. Нашы настаўнікі — Ніна Плавінская, Людміла Грынчук — ніколі не прымушалі нас чытаць савецкія кніжкі. Затое не зневажалі нас цэнзурай або забаронамі.

У нас былі найлепшыя ў горадзе выкладчыкі беларускай мовы — Канстанцін Валасевіч і Мікалай Касцян. Менавіта яны па крупінках закладалі ў нас асновы беларускай самасвядомасці. На гэтым настойваў Герман. І хаця ў гэты час большасць школьнікаў у Мінску наогул не вывучала беларускую мову, у ССМШ нікому — нават дзецям начальнікаў і вайскоўцаў — не дазвалялася грэбаваць урокамі беларушчыны.

Дырэктар быў суровы і не дазваляў крыўдзіць дзяцей, асабліва таленавітых. За пастаўленую двойку па фізіцы або па геаграфіі настаўнік мог пазбыцца пасады. Але мы, дзеці, тады яшчэ не разумелі, што Герман — наш галоўны абаронца. Пачуўшы яго голас, мы ў жаху хаваліся пад парты.

Не ведаю, як ён намовіў партыйнае начальства, што будынак школы неабходна пашырыць. Але ў 1966 годзе ў двары школы быў узведзены шасціпавярховы корпус з белай сілікатнай цэглы. А праз тры гады над губернатарскім домам надбудавалі яшчэ два паверхі і велічэзную канцэртную залу. Гістарычны будынак змяніўся да непазнавальнасці, але тады на гэта ніхто не зважаў. Галоўнае, у школе з'явілася шмат новых памяшканняў. Закупілі дзясяткі дарагіх нямецкіх і чэшскіх раяляў. Паклалі паркет і дывановыя дарожкі. Зрабілі гукаізаляцыю. Герман асабіста з галоўнай прыбіральшчыцай цёткай Дусяй правяраў, каб у нас быў зменны абутак (абавязкова чэшкі!) і нарукаўнікі. Чысціня была такая, што ўсё блішчэла.

Пасля смерці Германа бляск хутка пацьмянеў. Новы дырэктар Чарныш не надта клапаціўся пра чысціню падлогі. Затое ў экзаменацыйную сесію чвэрць класа знікала. Хтосьці падчас экзамену спалохаўся і не змог паказаць, на што быў здольны. У кагосьці з віны няўмелых выкладчыкаў балелі рукі... Я сама амаль усю школу прамучылася з хворымі, заціснутымі рукамі, але праз пакуты і боль спраўлялася. А нехта не здолеў.

За наступнымі дырэктарамі — з адукацыяй па класе баяна і поўнай пустэчай у душы — выганяць сталі за дрэнныя паводзіны, за двойку па сальфеджыа (у дзіцяці з абсалютным слыхам!)... Малаадукаваныя галасістыя цёткі пачалі дыктаваць нашым любімым настаўнікам, як ім весці ўрокі. Пазачынялі вучнёўскія клубы, у якіх мы самі чыталі лекцыі і праводзілі дыскусіі...

У 1989 годзе, калі ў краіне падзьмуў вецер перамен, дырэктарам прызначылі выдатнага педагога і чалавека Уладзіміра Кузьменку. Ён здолеў адшукаць баланс паміж прафесійнай бескампраміснасцю і чалавечай дабрынёй. Паміж любоўю да музыкі і дзяцей і імкненнем да поспеху. Ніколі раней столькі вучняў і выпускнікоў школы не перамагала на буйных музычных конкурсах. Дастаткова ўзгадаць найболей тытулаваных лаўрэатаў — піяністаў Андрэя Паначэўнага і Андрэя Шыбко.

У 2004 годзе Кузьменкі не стала, але яго справу працягвае вучань — Андрэй Калядзіч. У найбліжэйшыя дні ў будынку пачнецца капітальны рамонт, так што сапраўднага свята пакуль не атрымліваецца. Але вельмі хочацца верыць, што хутка тут ізноў заблішчыць падлога, лакаваныя бакі дарагіх раяляў... і таленавітыя вучні.

## Музыка сцісла

**• Kriwi далі канцэрт у Мінску.** Праграма Musicband ужо была прэзентаваная ў Берліне, але пакуль незнаёмая беларускім слухачам. Цяпер гурт шукае канцэртных агентаў, якія маглі б арганізаваць тур па Беларусі. Kriwi — гэта ўнікальны праект, бо музыканты жывуць у розных краінах — Германіі, Нарвегіі, Расіі, Беларусі — і сустракаюцца для рэпетыцый і канцэртаў. Гурт атрымаў «Рок-карону» у 1999 годзе, салістка Вераніка Круглова — тытул «Рок-князёўна» у 1998 і 1999 гадах. Гурт удзельнічаў у праектах «Народны альбом», «Я нарадзіўся тут», «Святы вечар», Personal Depeche і інш.


КСЕНІЯ АВІМАВА. БЕЛАПАН

**• Вайцюшкевіч запісаў альбом «Беларуская песня».** Трынаццаць кампазіцый з яго — на словы Уладзіміра Караткевіча. Да 80-годдзя пісьменніка і быў прымеркаваны выхад «Беларускай песні». «Заяц варыць піва», «Пяць струкоў перцу», «Расплату» цяпер можна праспяваць. Таксама ў альбом увайшлі песні на словы Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна, Уладзіміра Някляева, Адама Русака.

**• Памёр бубнач Ігар Маскаленка.** Ігар «Маскаль» быў знойдзены мёртвым на адной з цэнтральных вуліц Мінска. Па адной з версій, прычынай смерці мог стаць востры прыступ панкрэатыту. Ігар Маскаленка пачынаў у адным з першых трэш-металічных беларускіх гуртоў «7 Герц». У канцы 1980-х прыйшоў у «Тарнада». Супрацоўнічаў з «Крамай», «Улісам», «Мантанай», ансамблем «Песняры». У апошнія гады іграў у мінскіх рэстаранах. Цела Ігара Маскаленкі было крэміравана.

**• У Мінску спяваў Хасэ Карэрас.** Галоўным пытаннем перад канцэртам стаў выбар музычнага суправаджэння. Найлепшым кандыдатам на акампанемент тэнару прызналі Прэзідэнцкі аркестр Беларусі. Творчасць Хасэ Карэраса вядомая па ўсім свеце. Гэты оперны спявак знакаміты сваім выкананнем твораў Пучыні і Вердзі. Праўда, найлепшыя яго часы засталіся даўно ў мінулым.

**СМ; БелаПАН**

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

## Презентацыя кнігі ў гонар айца Надсана

Кніга «Сонца тваё не закоціцца, і месяц твой не схаваецца: Зборнік артыкулаў па беларусістыцы і багаслоўі ў гонар 80–годдзя з дня нараджэння і 50–годдзя святарства айца Аляксандра Надсана» (Мінск: Тэхналогія, 2009) нарэшце выйшла з друку. Адбудуцца тры публічныя прэзентацыі кнігі з удзелам а. Аляксандра Надсана.

**20 кастрычніка** — Вільня (Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт), Valakupių g., 5, аўдыторыя 213, у 13.00.

**21 кастрычніка** — Мінск, Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук, вул.Сурганава,15, прэзэнтацыйная зала (пакой 110), а 17–й.

**11 снежня** — Лондан: Згуртаванне беларусаў Вялікай Брытаніі, 52 Penn Rd, London N7 9RE, а 16–й.



АРЦЁМ ЛЯВА

**Алесю Шатэрніку — 70. 16 кастрычніка 70-годдзе адсвяткаваў скульптар, жывапісец, сябра мастакоўскай суполкі «Пагоня» Алесь Шатэрнік. Аўтар помнікаў Рагнедзе, Усяславу Чарадзею, Тадэвушу Касцюшку ды многім іншым выбітным беларускім асобам марыць убачыць у цэнтры сталіцы галоўны твор свайго жыцця — скульптурную кампазіцыю, якая адлюструе шлях народа да незалежнасці. Рэдакцыя «Нашай Нівы» далучаецца да віншаванняў гэтаму дужаму, магутнаму чалавеку. Многая лета!**

# Консул БНР у Маскве

**20 кастрычніка спаўняецца 125 гадоў з дня нараджэння Аляксандра (Алеся) Бурбіса.**

Тут друкуецца не нарыс жыцця і творчасці гэтага таленавітага чалавека, сузаснавальніка Беларускае Сацыялістычнае Грамады, арганізатара рэвалюцыйнага змагання ў 1905—1906, вязня Лукішак, арганізатара беларускага хору і беларускае драматычнае дружыны ў Вільні, заснавальніка эканамічнае геаграфіі Беларусі, аднаго з першых гісторыкаў беларускага нацыянальна-вызвольнага руху і беларускага тэатра (яго ўспаміны «Колькі слоў аб беларускім тэатры і хоры» друкуюцца сёлета ў пятай кніжцы «Дзеяслова»), консула Беларускай Народнай Рэспублікі ў Маскве, намесніка народнага камісара замежных справаў БССР. Кожны, хто хоча даведацца пра Аляксандра Бурбіса болей, можа разгарнуць другі том Энцыклапедыі гісторыі Беларусі і прачытаць грунтоўны артыкул Міхася Біча.

Тут друкуецца прамова, якую яшчэ адзін рэвалюцыянер і змагар за Беларусь, Язэп Лёсік, сказаў над свежавыкапанаю магілаю Аляксандра Бурбіса 22 сакавіка 1922 года на Старажоўскіх могілках у Мінску.

**«Без нацыянальнага вызвалення не можа быць вызвалення сацыяльнага».**

Алесь Бурбіс быў з плеяды тых патрыётаў Беларусі, якіх назвалі нацыянал-камуністамі (Зміцер Жылуновіч, Усевалад Ігнатоўскі, Аляксандр Чарвякоў і дзясяткі іншых дзеячаў). У адрозненне ад бальшавікоў, беларускім нацыянал-камуністам, як і сацыял-дэмакратам, імпанавала тое, што пісаў «позні» Энгельс, а менавіта — што без нацыянальнага вызвалення не можа быць вызвалення сацыяльнага, што інтэрнацыяналізм, пра які так шмат казалі маскоўскія бальшавікі, магчымы толькі паміж самастойнымі, г. зн. раўнапраўнымі народамі. Язэп Лёсік акцэнтаваў увагу на гэтым.

На маю думку, жалобная прамова Язэпа Лёсіка з'яўляецца выдатным творам беларускай аратарскай прозы. 24 сакавіка 1922 года яе надрукавала «Савецкая Беларусь».



**Дзеячы БНР. Першы злева сядзіць Алесь Бурбіс.**

Выклікаючы ў памяці слухачоў вобраз прарока Майсея, нагадваючы гісторыю Выхаду народа Ізраілевага з Егіпта, Язэп Лёсік звяртаецца да ўжо нежывога Аляксандра Бурбіса і кажа: «Спі ж спакойна, беларускі прароча! Ты не дайшоў яшчэ да Абяцанае Зямлі, не дойдзе яшчэ і шмат хто з нас, бо ўсе мы ў няволі радзіліся і мусім памерці, як тое жыдоўства, што вадзіў Майсей па пустыні».

Гэта было няйначай як прадбачанне і лёсу таварышаў, якія складуць свае галовы ў 1930-х гадах, і свайго асабістага лёсу.

**Анатоль Сідарэвіч**

# Язэп Лёсік. Прамова над магілай Аляксандра Бурбіса

Таварышы і грамадзяне! Я прыйшоў сюды, каб ад імя Інстытута беларускай культуры прынесці апошняе ўшанаванне і перадаць апошняе прашчай найлепшаму сыну Беларусі, добраму грамадзяніну і дарагому нашаму таварышу Аляксандру Бурбісу. Як чорная хмара, звісла над Беларуссю пахавальная жалоба. Адзін за другім зыходзяць у магілы найлепшыя людзі нашай многапакутнай старонкі, нашы нацыянальныя прарокі.

Рэвалюцыя, вялікая расейская рэвалюцыя, што разбіла страшны расейскі астрог народаў ды насцеж расчыніла дзверы на волю, на шырокія прасторы нацыянальнага і сацыяльнага перабудавання, — гэтая рэвалюцыя разам з радасцю вызвалення прынесла нам, беларусінам, найцяжэйшы ўдар. Ніводзін народ на тэрыторыі бышай Расейскай імперыі не дазнаў такіх цяжкіх страт у людзях — правадырах, як нашая старонка Белая Русь. У самым пачатку рэвалюцыі зышоў у сырую зямельку наш слаўны паэта, пясняр хараства, вялікі замілавальнік свае няшчаснае Айчыны Максім Багдановіч. Памёр ад сухот, 23-летнім юнаком (М. Багдановіч жыў 25 гадоў. — АС) з мальбою ў вуснах: «Маці родная, маці краіна! Ты прабач, ты прымі свайго сына, за цябе яму ўмерці дазволь!»

Роўна цераз год пайшоў за ім у халодную магілу таксама ад сухот другі наш паэта, беларускі лірнік Каганец. А яшчэ цераз год за імі ўслед пайшоў у маладым 37-летнім веку (І. Луцкевіч пражыў 38 гадоў. — АС) рэвалюцыянер, піянер беларускага адраджэння, публіцыст і вучоны Іван Луцкевіч, памёршы гэтаксама ад сухот. А пазалетась увосень дзесь у далёкай Галіцыі пахавалі яшчэ аднаго нашага рэвалюцыянера і слаўнага паэта, перажыўшага ў Сібіры вечнае пасяленне да рэвалюцыі, Алеся Гаруна. У Галіцыі ён лячыўся ад сухот і памёр, пайшоў, як свечка, да неба і панёс з сабою свае «думкі-дыяменты» (Непасрэднаю прычынаю смерці А. Гаруна (28.07.1920) была крываўка. Пахаваны ён у Кракаве. — АС). А вось сёлета, яшчэ на прошлым тыдні, заграннічныя газеты прынеслі новую жалобную вестку — аб смерці найстарэйшага адраджэнца і пісьменніка Ядвігіна Ш., Антона Лявіцкага, і гэтаксама ад сухот. А сёння мы сышліся сюды, каб пахаваць у сырую зямельку новую ахвяру сухот — рэвалюцыянера і слаўнага беларуса-адраджэнца Аляксандра Бурбіса.

Як чорная хмара, звісла над Беларуссю пахавальная жалоба.

Што ж гэта за фатальная доля такая, што ўсіх іх скасіла смерць сухотамі? Дзе прычына таго, што беларускі паэт і пісьменнік, беларускі вучоны, беларускі грамадзянскі дзеяч, беларускі рэвалюцыянер уміpae ад сухот — ад хворасці, што развіваецца толькі ў падвойна цяжкіх, у падвойна ненармальных умовах жыцця?

А прычына тут тая, што яны былі не толькі паэтамі і пісьменнікамі, не толькі вучонымі грамадзянскімі дзеячамі, не толькі рэвалюцыянерамі-сацыялістамі і камуністамі, а былі яны яшчэ і беларусінамі. Яны неслі на плячох сваіх падвойны цяжар, падвойны крыж, і гэтым другім крыжам на раму іх была беларуская справа, нацыянальнае адраджэнне. У дарэвалюцыйныя часы, у часы царызму быць беларусам — гэта значыла наразіць сябе на ўсе няшчасці свету гэтага. Арыштам, астрогам, кайданамі, Сібір'ю і катаргай караў беларуса царызм, а пасмешкі, здзек, зняважэнне і гвалт сустракаў беларусін з боку ўсяго грамадзянства, пачынаючы ад пана-буржуя і канчаючы хамам-пралетарам.

Беларусін у дарэвалюцыйныя часы — гэта шаленец, вар'ят, камедыянт, апошні чалавек, з каторым ганьбавалі вітацца знаёмыя, а свае родныя выракаліся і праклінаі іх адшчапенца і выракда. Гэтага цяжару, гэтай пякельнай мукі не мог вытрымаць ніякі, нават зялезны чалавечы арганізм. А цяпер? Хіба не абліваецца крывёю сэрца беларусіна, пазіраючы на тое, як яго маці-краіна разрэзана на часці, як жывое чалавечае цела? Хіба гэта не пякельная мука, хіба гэта не агонь, з полымем каторага не можа супярэчыць ніякае чалавечае жыццё?..

Вось гэтага падвойнага цяжару, гэтай мукі не мог вытрываць і нябожчык А.Бурбіс — захварэў ён на сухоты ды памёр. Не выдзержалі сілы яго таго непамернага цяжару, каторы ўзлажыў ён на рамя сваё і нёс аж да смерці з самага пачатку 1900-х год. Нябожчык выйшаў на нацыянальна-рэвалюцыйную працу дaўно, яшчэ маладзенькім хлапчуком, працаваў 22 гады і сапачываў хіба толькі тагды, калі царскі ўрад садзіў яго ў вастрог. Нябожчык быў першым свядомым беларусінам-сацыялістам; ён першы выступаў на мітынгах, на сходах з рэвалюцыйнымі прамовамі па-беларуску. У тыя дарэвалюцыйныя часы публічнае выступленне па-беларуску было так неспадзявана, як гром у ясную пагоду. А што важней за ўсё, дык гэта тое, што нябожчык быў у першым ліку тых, хто ў 1902 г. прагаласіў лозунг незалежнасці Беларусі, хто без дзяржаўнай незалежнасці не бачыў сацыяльнага вызвалення працоўных мас. Нябожчык Бурбіс быў першым закладчыкам першай рэвалюцыйна-нацыянальнай беларускай партыі — «Бел. Сац. Грамады».

Апошнім часам ён стаў камуністам, але ні на момант не забываў, што не «адзіным хлебам жыў бывае чалавек», што ў царства сацыялізму ўвойдуць не пралетары *краёў*, а пралетары народаў, што сацыялістычны інтэрнацыянал — гэта не сума людзей без нацыянальнага твару, а грамада нацыянальна свядомых народаў. Коратка кажучы, нябожчык разумеў, што без нацыянальнага вызвалення не можа быць і сацыяльнага вызвалення. А нацыянальнае вызваленне ён мысліў як поўную непадзельную дзяржаўную незалежнасць для свайго беларускага народа. Але не дажыў да гэтага шчасця. Ён пакінуў свой народ, сваю Маці-Беларусь яшчэ ў муках вызвалення, падзеленую на часці. Адну ён меў нагароду за сваю цяжкую працу беларусіна-рэвалюцыянера. Перад смерцю ён ужо мог узайсці на тую высокую гору, адкуль, як і Майсей, азіраў Абяцаную Зямлю Беларускага Народа. Ён ужо бачыў тыя шырокія светлыя прасторы, пад якімі запануе многапакутны беларускі народ, дзе ён будзе гэтаксама працаваць, жыць і бароцца за новае і яшчэ лепшае жыццё, але барацьба яго асалодзіцца невымоўнаю радасцю свае ўласнай нацыянальнай творчасці, каторай не адчуваюць і не разумеюць усе нацыянальна сытыя народы (*Нацыянальна сытыя (насычаныя) народы* — тэрмін, які сустракаецца ў працы Ота Баўэра «Нацыянальнае пытанне і сацыял-дэмакратыя». — АС).

Спі ж спакойна, беларускі прароча! Ты не дайшоў яшчэ да Абяцанае Зямлі, не дойдзе яшчэ і шмат хто з нас, бо ўсе мы ў няволі радзіліся і мусім памерці, як тое жыдоўства, што вадзіў Майсей па пустыні.

Спачывай, найлепшы сыне Беларусі! Імя тваё не забудзецца ніколі! Чырвонымі, агнёвымі літарамі будзе ўпісана яно ў гісторыі нацыянальнага адраджэння і рэвалюцыйнага руху Беларусі!

Тут, у роднай зямельцы, у жоўтым пясочку, тут, быць можа, у брудзе знойдуць твае слабыя грудзі сабе пакой! А ты, родная зямелька... Не будзеш цяжкая ты сыну свайму, зямля!

# Крэмль хоча звольніць «за ідыятызм» губернатара, які сфатаграфаваў чарвяка



Памочнік кіраўніка Расіі па міжнародных пытаннях Сяргей Прыходзька назваў безадказным і неразумным запіс кіраўніка Цвярской вобласці Дзмітрыя Зяленіна ў твітар пра прыём у Аляксандраўскай зале Крамля з нагоды візіту ў Расію прэзідэнта Германіі Крысціяна Вульфа.

Напярэдадні ў мікраблогу Зяленіна ў твітары з’явіўся запіс: «Такое здараецца і ў Аляксандраўскай зале. Разам з ялавічынай падаюць салаты з жывымі дажджавымі чарвякамі» са спасылкай на фота, зробленае на мабільны тэлефон. Пазней запіс і фатаграфія былі выдаленыя. Аднак яны паспелі шырока разысціся па інтэрнэце.

«На шчасце, я займаюся пытаннямі замежнай палітыкі, але павінен быў бы, напэўна, парэкамендаваць сваім калегам-юрыстам увесці ў фармулёўкі па ацэнцы дзейнасці губернатараў такі артыкул, як «звальненне за ідыятызм». А пра безадказнасць і глупства казаць нават не буду», — сказаў Прыходзька, адказваючы на просьбу пракаментаваць запіс Зяленіна.

Прыходзька таксама дадаў, што «ўсім, хто хацеў бы паклікаць спадара Зяленіна ў госці да сябе дадому, я б рэкамендаваў сур’ёзна падумаць, перш чым гэта рабіць».

Нагадаем, што нядаўна прэзідэнт Мядзведзеў звольніў мэра Масквы Лужкова ў сувязі са «стратай даверу».

**КаМ**

ДЗЯРЖАВА ДЛЯ НАРОДА

## У Гродне адкрываецца сэкс-шоп для сарамлівых

Ён будзе ў гандлёвым цэнтры каля гандлёвага дома «Нёман».

«Фішкай» павінна стаць паслуга для сарамлівых — індывідуальнае наведванне сэкс-шопа да адкрыцця ці пасля закрыцця за зачыненымі дзвярамі.

Цэны ў сэкс-шопе будуць прыкладна такімі ж, як у беларускіх інтэрнэт-крамах.

КОЛЫ

## З’явіцца беларускі легкавік?

**Вытворца «Самандаў» прапануе выбраць для яго назву.**

Кампанія «Юнісон», якая займаецца зборкай аўтамабіляў Samand LX у Беларусі, мае пэўныя планы на выпуск беларускага аўтамабіля. Але пакуль іх не агучвае.

Цяпер вырашаецца пытанне з назвай. На сайце samand.by праводзіцца адмысловае галасаванне, у якім акцэнт робіцца на мове. Бальшыня апытаных хоча, каб марка аўто была беларускамоўнай, а само слова неабавязкова павінна быць звязана з краінай.

Іранскі легкавы аўтамабіль Samand у Беларусі пачалі збіраць у 2006 годзе.

Першым беларускім аўтамабілем можна лічыць мадэль, якая з’явілася ў пачатку мінулага стагоддзя ў Вільні. Гэта было раскошнае аўто, якое пастаўлялася кіраўнікам еўрапейскіх краін. Выпушчана было каля 15 аўтамабіляў. У пачатку 1990-х у Слоніме на базе «Масквіча» выпускалі легкавікі «Шчара» і «Сланяня». Іх і сёння можна бачыць на вуліцах горада.

**Кастусь Матушыч**

ІХ НОРАВЫ

## У ЗША горны казёл забадаў пенсіянера да смерці

У амерыканскім штаце Вашынгтон пажылы мужчына памёр пасля нападу горнага казла.

Інцыдэнт адбыўся ў мінулую суботу ў нацыянальным парку «Алімпік». Мужчына 63 гадоў шпацыраваў у лесе, калі на яго напаў горны казёл. Праз некалькі гадзін пацярпелы памёр у шпіталі.

Прадстаўнікі ўладаў не паведамілі падрабязнасцяў здарэння, аднак адзначылі, што характар ранаў на целе загінулага сведчыць пра тое, што яны былі атрыманыя ў выніку нападу менавіта такой жывёлы.

Пазней казла высачылі і забілі паляўнічыя. Труп будзе дастаўлены ветэрынару для правядзення экспертызы.

**КаМ**

ЧАГО Ж МНЕ НЕ ПЕЦЬ

## Індзейцы ў Астрашыцкім гарадку

Міжнародны фестываль індзейскай культуры Indian Spirit пройдзе 7–9 студзеня 2011 года ў Астрашыцкім Гарадку (Мінскі раён).

Фестываль пройдзе ў пансіянаце «Тэатральны», ладзіць яго гісторыка-культурны цэнтр «Рыцарскі замак».

Праграма не абмяжуецца культурай амерыканскіх індзейцаў. Фестываль наведаюць людзі, якія рэканструююць побыт і культуру індзейскіх плямёнаў, спевакі і танцоры. Другі дзень мерапрыемства пройдзе ў стылі кантры. У межах фестывалю адбудзецца дэгустацыя страў індзейскай кухні.

Арганізатары разлічваюць на 30 індзеаністаў. Іх не так шмат, па ўсім былым СССР прыкладна 60 чалавек. Усяго ж на фестывалі плануюць сабраць каля 400–500 чалавек.

Акрамя таго, прайшлі перамовы з чукчамі — сваякамі індзейцаў, некалькі з іх, верагодна, наведаюць фестываль.

Ахвотныя далучыцца да экзатычнай культуры змогуць набыць квіткі коштам 30–35 тыс. рублёў. Тыя, хто прыйдзе на фестываль у адпаведных святу строях, заплацяць напалову менш.

**БелаПАН**



## Адкусіў галаву мышы — абвінавачаны ў жорсткім абыходжанні з жывёламі

Шведскі суд пачынае разглядаць справу 23-гадовага жыхара выспы Готланд. Падставай для завядзення крымінальнай справы стаў відэаролік, зняты на камеру мабільнага тэлефона, у якім малады чалавек адкусвае галаву жывой мышы.

Відэазапіс працягласцю менш за хвіліну быў зроблены сябрамі падсуднага. Сам ён, трымаючы мыш за хвост, спачатку адкусіў ёй галаву, а затым дэманстраваў перад камерай тое, як кроў сцякае з трупіка.

«Ён цалкам неабгрунтавана падвергнуў жывёлу пакутам», — заявіў журналістам дзяржабвінаваўца.

Калі суд прызнае яго вінаватым, яму пагражае турэмнае зняволенне тэрмінам да двух гадоў.

**КаМ**

НАСТРОЙ

## Старыя смяюцца ў сто разоў радзей за малых

Навукоўцы з універсітэта Гламоргана ва Уэльсе высветлілі, што пачуццё гумару рэзка слабее ў людзей, якім болей за 52 гады. Выявілася таксама, што мужчыны сталага веку больш бурклівыя ў параўнанні з жанчынамі: у 60 год яны бурчаць і наракаюць на жыццё ў чатыры разы часцей за сваіх равесніц.

Дзеці да 12 год смяюцца вельмі часта — да 300 разоў на суткі, цвердзяць навукоўцы.

Падлеткі — у сярэднім 6 разоў. Тыя, каму за 20 — усяго чатыры разы. А вось трыццацігадовыя смяюцца часцей, бо ў гэтым ім дапамагаюць іхнія дзеці. Далей жыццё робіцца менш забаўным. Пасля 40 людзі смяюцца звычайна тройчы на дзень, а потым — яшчэ радзей.

**Сяргей Мікулевіч**

ЛЮБОШЧЫ

## Самыя незвычайныя абрады народаў свету

Шмат цікавага і нязведанага тояць у сабе традыцыі. Загадкавая і фундаментальная для выжывання тэма сэксу не магла застацца ўбаку і, натуральна, знайшла сваё адлюстраванне ў розных абрадах і звычаях, часам вельмі дзіўных.

**Паўночная Камчатка:** Да сёння ў глухіх паселішчах Паўночнай Камчаткі захоўваецца шматвяковая традыцыя: госць займаецца сэксам з жонкай гаспадара дома. Прычым дзеля згоды госця жанчына гатовая на ўсё, бо гэта лічыцца вялікім гонарам. А калі пасля акта жанчына зацяжарыць, то поспех і шчасце будуць заўсёды спадарожнічаць гэтаму дому і ўсяму паселішчу. Гэтаму ёсць навуковае тлумачэнне: у ізаляваных супольнасцях абмен генетычным матэрыялам быў жыццёва важны для захавання роду.

**Аўстралія:** Аўстралійскія абарыгены замест звыклага для нас поціску рукі прыязнасць дэманстравалі крыху іншым жэстам, а менавіта дакрананнем да чэлеса суразмоўцы. Рацыянальнае тлумачэнне гэтаму адшукаць цяжка. Так было прынята, і ўсё.

**Тыбет:** Для таго каб выйсці замуж, тыбецкая дзяўчына павінная мець на рахунку хаця б дзясятак сэксуальных партнёраў. Гэтая старажытная традыцыя мела пад сабой рэлігійныя падставы.

**Палінэзія:** Тут колькасць сэксуальных сувязяў нявесты не асабліва важная, аднак пры гэтым яна абавязкова мусіла мець як мінімум двух дзяцей, каб даказаць сваю пладавітасць.

**Германія:** Германія, як, зрэшты, і многія іншыя пратэстанцкія краіны Еўропы, славіцца вольнасцю сэксуальных звычак. Напрыклад, калі праходзіць карнавал, мінакі цалкам сур'ёзна прапаноўваюць адно аднаму заняцца сэксам і займаюцца ім, часам нават не знаёмячыся. Але такое здараецца толькі на карнавалах.

**Акіянія:** Мясцовыя норавы прымушалі нявесту выходзіць замуж цнатлівай, але перад тым як дзяўчына будзе дапушчаная да свайго жаніха, ёй трэ было прайсці абрад пазбаўлення цнатлівасці каменным нажом. Абрад праводзіўся сябрамі жаніха, якія цягам трох дзён могуць займацца з будучай жонкай свайго сябра сэксам. Толькі пасля «шчаслівая» маладая пераходзіла да свайго законнага мужа.

**Паўднёвая Афрыка:** Мужчыны мясцовых плямёнаў, баючыся прынесці патомства ў выглядзе блізнят, якія тут з'яўляюцца правобразам граху і самых страшных праклёнаў, выразалі сабе адно яечка. Зрэшты, як вядома, служкі гарэмаў Усходу — еўнухі — падвяргалі сябе больш страшнай экзекуцыі — абсалютнай кастрацыі.



**Цэнтральная Афрыка, племя шылукі:** Правадыр племені меў права атрымаць у жонкі самых прыгожых дзяўчат, нават калі іх будзе больш за сотню. Але калі яго жонкі завядуць размову пра тое, што іх муж-правадыр не задавальняе іх, небараку пагражае не толькі пазбаўленне ганаровай пасады, але і смерць у страшных пакутах, бо, як кажа павер'е шылукаў, імпатэнт не можа перадаць сілу ўрадлівасці зямлі і быдлу.

**Японія і Карэя:** Спрадвек і да сёння для ўзмацнення жарсці японцы і карэянкі карыстаюцца сваім каронным прыёмам — уколамі пахвіны залатой іголкай.

Бясспрэчна, некаторыя звычаі далёкіх ад нас народаў здаюцца нам жахлівымі, але, хто ведае, можа, і некаторыя нашы дурныя звычкі выклікалі б у іх шок.

**Сцяпан Батура**




## СПОРТ

### «Шэрыф»—БАТЭ

Матч «Шэрыф»—БАТЭ ў групавым турніры Лігі Еўропы пройдзе **21 кастрычніка ў Ціраспалі, 4 лістапада каманды згуляюць у Мінску**. Дарэчы, малдаўскі клуб з левага берага Днястра цяпер трэніруе беларускі спецыяліст Андрэй Сасніцкі.

## КАНЦЭРТЫ

### Публічнае вяселле ў «Рэактары»

**24 кастрычніка ў клубе «Рэактар» (вул.Харужай, 29) а 18-й** — сумесны канцэрт гуртоў **Znich**, «**Рокаш**», «**Сок**», «**Рокерджокер**», «**Змяя**», **Unia** і інш., прысвечаны вяселлю саліста гурта Znich Алеся і Алесі Таболіч.

### Камерата

**26 кастрычніка ў «Лісінай нары» (вул.Каліноўскага, 32) а 19-й** — канцэрт вакальнага ансамбля «Камерата».

### Крама

**27 кастрычніка а 21-й у «Jack club» (вул.Няміга, 12)** — канцэрт гурта «Крама».

## ВЫСТАВЫ

### Выстава плакатаў Яфіма Тараса

**25 кастрычніка ў памяшканні Саюза дызайнераў Беларусі** адбудзецца імпрэза памяці Яфіма Тараса — беларускага мастака-графіка, бацькі пісьменніка Валянціна Тараса і дзеда публіцыста Віталя Тараса. Яфім Тарас нарадзіўся 25 мая 1910 года ў Мінску. Скончыў славутую мастацкую вучэльню ў Віцебску, але большую частку жыцця пражыў у сталіцы Беларусі. У 1981-м яго не стала. У творчай спадчыне мастака — мастацкае афармленне і ілюстрацыі да кніг Янкі Купалы, Якуба Коласа, твораў Аляксандра Пушкіна ў перакладзе на беларускую мову і іншых. У 50-я — 60-я гады мінулага стагоддзя Яфім Тарас стварыў мноства арыгінальных плакатаў, якія за савецкім часам выконвалі функцыю сацыяльнай і побытавай рэкламы. Працы для юбілейнай выставы ласкава надаў Саюз дызайнераў Беларусі, які сабраў і зберагае багатую калекцыю айчыннага плаката. На вернісаж запрашаюцца ўсе, хто цікавіцца гісторыяй сучаснага мастацтва. Адрас Саюза дызайнераў — **вул.Брылеўская, 14 (уваход з двара)**. Можна даехаць аўтобусамі №40, 53, 100 да прыпынку «Гатэль «Спадарожнік».

### Юбілейная выстава Алеся Шатэрніка

Выдатны беларускі скульптар, аўтар Звана Свабоды Алесь Шатэрнік адсвяткаваў сваё 70-годдзе 16 кастрычніка. Да гэтай нагоды 14-га **ў Літаратурным музеі (Мінск, Багдановіча, 13, гэта ў Траецкім прадмесці)** адчынілася ягоная юбілейная выстава «Сонцапрамень. Жывапіс. Скульптура. Імпрэсія».

### Смерць — гэта не правасуддзе

**Да 11 снежня ў Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны** працуе выстава «Смерць — гэта не правасуддзе». Гэта выстава мае на мэце паказаць, што смяротнае пакаранне мусіць быць адмененае.

### Выцінанкі Вячаслава Дубінкі

**Да 24 кастрычніка ў музеі Максіма Багдановіча (вул.М.Багдановіча, 7а, што ў Траецкім прадмесці)** працуе выстава выцінанак Вячаслава Дубінкі «Я проста ў далёкай вандроўцы...», прысвечаная памяці знакамітага майстра. У экспазіцыі прадстаўлены 32 творы мастака розных гадоў. Дубінка быў, як выразіўся мастак Алесь Марачкін, «класікам народнага мастацтва», універсальным творцам, хаця і не меў вышэйшай мастацкай адукацыі. Пасол Швецыі ў Беларусі Стэфан Эрыксан таксама лічыць Дубінку ўнікальнай з'явай беларускай культуры. Выстава працуе **да 29 кастрычніка**.

### Гербарый часу

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Незалежнасці, 47) да 30 кастрычніка** — выстава «Гербарый часу». Увазе гледачоў прапануюцца творы жывапісу і графікі маладых мастакоў — Таццяны Казанцавай, Ірыны Ясюкайць-Дударавай, Таццяны Грыневіч і Соф`і Піскун.

### Фатограф свайго часу

**У Гістарычным музеі да 31 кастрычніка** працягваецца выстава «Фатограф свайго часу», прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння беларускага фотамайстра Ісака Салавейчыка. На выставе можна пабачыць арыгіналы і копіі фатаграфічных работ Ісака Салавейчыка — партрэты дзеячаў беларускай навукі і культуры, — створаныя ў перыяд 1952—1960 гг. падчас ягонай працы ў газеце «Літаратура і мастацтва» і Дзяржаўным мастацкім музеі БССР.




## ІМПРЭЗЫ

### «Лёсы» Аляксандра Тамковіча

**22 кастрычніка ў офісе Партыі БНФ** — прэзентацыя кнігі Аляксандра Тамковіча «Лёсы», прысвечанай лёсам слаўных людзей нашага часу. **Пачатак а 17-й.**

### Беларуская літаратура нулявых

Выдавецтва «Логвінаў» і Ігар Бабкоў запрашаюць вас на круглы стол «Беларуская літаратура нулявых: хто, чаму, як» і прэзентацыю паэтычнага зборніка Максіма Шчура, якія адбудуцца **20 кастрычніка а 18-й гадзіне ў кнігарні «ЛогвінаЎ» (галерэя «Ў», Кісялёва, 3а)**.

### Паходжанне славян

**29 кастрычніка ў Беларускім ПЭН-Цэнтры ў 18.45** адбудзецца семінар навукова-краязнаўчага таварыства «Загароддзе». Тэма: «Паходжанне славян». Дакладчык: Ф.Д.Клімчук. Адрас на рагу дзвюх вуліц: **вул. Залатая Горка, 2-101 (па вул. Казлова дом мае нумар 7)**. Гэта насупраць кінатэатра «Мір».

### Папулярная музыка з Вітулы

**20 кастрычніка ў 17.30 у актавай зале філалагічнага факультэта БДУ** пачнецца прэзентацыя беларускага пераклада рамана шведскага пісьменніка Мікаэля Ніемі «Папулярная музыка з Вітулы». У прэзентацыі возьме ўдзел аўтар рамана — папулярны шведскі пісьменнік Мікаэль Ніемі. Апроч таго — Віктар Шалкевіч, Уладзімір Арлоў, Валянцін Акудовіч, Стэфан Эрыксан, Ігар Варашкевіч.

### Невядомыя лісты Язэпа Драздовіча

Лекцыя Ю.Малаша «Невядомыя лісты Я.Драздовіча» адбудзецца **22 кастрычніка а 18-й на сядзібе ТБМ**.

### Паміж блогам і калгасам: Беларусь за два месяцы да прэзідэнцкіх выбараў

Запрашэнне на публічную дыскусію **21 кастрычніка а 19-й у цэнтры Monbijou, Oranienburger Str. 13/14, 10178 Берлін**.




## ТЭАТРЫ

**20 кастрычніка**

**Оперы і балета** — «Набука»
**Імя Горкага** — «Анджэла і іншыя»
**Беларускай драматургіі** — «Палёты з анёлам»
**Імя Янкі Купалы** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»

**21 кастрычніка**

**Оперы і балета** — вечар старадаўняга раманса
**Імя Янкі Купалы** — «Гендэль-Бах»
**Імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце лепей»
**Беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»

**22 кастрычніка**

**Імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»
**Беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраўнд»
**Оперы і балета** — «Рускія сезоны XXI стагоддзя»
**Лялек** — «Дом, які пабудаваў Свіфт»

**23 кастрычніка**

**Юнага гледача** — «Тры парсючкі»
**Лялек** — «Прыгоды Пін-Піна»
**Беларускай драматургіі** — «Адамавы жарты»
**Оперы і балета** — «Севільскі цырульнік»
**Імя Горкага** — «Эсфір»

**24 кастрычніка**

**Імя Горкага** — «Зорка сёмага неба»
**Юнага гледача** — «Бармалей»
**Лялек** — «Васіліса Прыўкрасная»
**Імя Горкага** — «Расейскія вадэвілі»
**Беларускай драматургіі** — «Дзённік паэта (Інтымны дзённік)»

**26 кастрычніка**

**Лялек** — «Марынка-крапіўніца»
**Імя Горкага** — «Я веру ў гараскопы»
**Беларускай драматургіі** — «Адэль»

**27 кастрычніка**

**Лялек** — «Балада пра белую вішню»
**Юнага гледача** — «Маленькі лорд Фаўнтлерой»
**Імя Горкага** — «Бег»
**Беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»

**28 кастрычніка**

**Лялек** — «Мыйдадзір»
**Беларускай драматургіі** — «Чарнобыльская малітва»
**Імя Янкі Купалы** — «Паўлінка»
**Імя Горкага** — «Сунічная паляна»

**29 кастрычніка**

**Лялек** — «Піпі-Доўгаяпанчоха»
**Імя Горкага** — «Легенда пра беднага д'ябла»
**Імя Янкі Купалы** (Малая сцэна) — «Востраў Сахалін»
**Імя Янкі Купалы** — «Вечар»
**Оперы і балета** — «Тоска»
**Беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»

**30 кастрычніка**

**Юнага гледача** — «Брык і Шуся шукаюць лета»
**Лялек** — «Мыйдадзір»
**Беларускай драматургіі** — «Дамавічкі»
**Оперы і балета** — «Тоска»
**Беларускай драматургіі** — «Яго апошняе каханне (Лета)»
**Імя Горкага** — «Пакінутая жанчына (Мачаха)»

**31 кастрычніка**

**Імя Горкага** — «Каштанка»
**Юнага гледача** — «Брык і Шуся шукаюць лета»
**Лялек** — «Піпі-Доўгаяпанчоха»
**Беларускай драматургіі** — «Калі скончыцца вайна»
**Імя Горкага** — «Адзіны спадкаемца»
**Оперы і балета** — «Тоска»

## КІНО

# «Ваўкі» Аляксандра Колбышава

Беларусь, 2009, каляровы, 103 хв.

**Рэжысёр:** Аляксандр Колбышаў

**Ролі выконваюць:** Дзмітрый Ульянаў, Андрэй Панін, Коля Спірыдонаў, Уладзімір Гасцюхін, Тамара Міронава, Сяргей Уласаў, Аксана Лясная, Галіна Кухальская, Святлана Нікіфарава

**Жанр:** Трагедыя паводле апавядання Аляксандра Чакмянёва

**Адзнака:** 7 (з 10)




Арыштант Кірыл Палятаеў бяжыць з ГУЛАГаўскага цягніка ў родную вёску. На яго пачынаецца паляванне. Саветы абвяшчаюць, што ўся вёска будзе рэпрэсаваная, калі ўцякач не знойдзецца. А ля лясной схованкі Палятаева выюць галодныя ваўкі...

Сюжэт карціны нагадвае «Аблаву» Васіля Быкава, пры гэтым Чакмянёў напісаў сваё апавяданне яшчэ ў 1963 годзе... Апавяданне доўга было забаронена.

Карціна Колбышава — гэта суровая трагедыя без героя, пастаўленая ў попельна-шэрых колерах з крывавымі сцягамі-плямамі. У кадры — ледзяны снег і хісткі агменьчык сумлення, машына рэпрэсій і слабы чалавек, які спрабуе выратавацца.

Гнюсны Андрэй Панін (карнік), зляканы Палятаеў (Дзмітрый Ульянаў), разважлівы Уладзімір Гасцюхін упрыгожваюць карціну.

Падае снег, выюць ваўкі, гучыць у дзіцячых вуснах малітва, складзеная Уладзімірам Замяталіным.

Карціна Аляксандра Колбышава — гэта цуд для сённяшняй Беларусі.

**Андрэй Расінскі**

# Беларускі інтэрнэт набірае хуткасць, але не таннее

## Цэны найвышэйшыя, а хуткасць найменшая сярод усіх суседзяў!

**Эвалюцыя цэн на неабмежаваны інтэрнэт**

| | Беларусь | Расія | Украіна | Латвія | Польшча | Літва | Эстонія |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2009 | 60 000 | 35 000 | 20 000 | 65 000 | 57 000 | 55 000 | 67 000 |
| Хуткасць (у Кб/с) | 256 | 2560/512 | 256/128 | 2048/512 | 2048 | 4096 | 1 024 |
| 2010 | 54 000 | 20 500 | 15 000 | 46 000 | 57 000 | 40 700 | 26 000 |
| Хуткасць (у Кб/с) | 512 | 1024/512 | 512 | 20 480 | 2048 | 6144 | 102 400 |

Зніжэнне цэн на інтэрнэт у Беларусі скончана ў аднабаковым парадку. «Мы дасягнулі такога ўзроўню цэн, што змяншаць іх няма куды», — заявіў намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белтэлекам» Андрэй Сабораў. Па яго словах, ні ў гэтым, ні ў наступным годзе цэны на інтэрнэт не плануецца рабіць меншымі. Прадстаўнік кампаніі-манапаліста заўважыў, што зараз праца будзе праводзіцца над павелічэннем хуткасці інтэрнэту: «Гэта наша асноўная перспектыва».

Сапраўды, хуткі і, пажадана, неабмежаваны інтэрнэт цяпер не раскоша, а патрэба часу. Павелічэнне канала звестак дазваляе глядзець відэаролікі з Ю-Туба, жывыя трансляцыі тэлеканалаў, абменьвацца шматгігабайтнымі фільмамі. Тое, што яшчэ два-тры гады таму для большасці карыстальнікаў выглядала фантастыкай і было даступным толькі некаторым ахвотнікам.

### Беларусь

Напрыклад, год таму самую выгадную ў краіне прапанову неабмежаванага інтэрнэту рабіла гандлёвая марка ByFly ад «Белтэлекама». На тарыфны план «Дамасед» (хуткасць 256 Кб у секунду) можна было падключыцца за 60 тысяч рублёў. За год «Дамасед» падрос у хуткасці і згубіў у цане — цяпер абавязковая абаненцкая плата складае 54 тысячы рублёў (хуткасць 512 Кб у секунду). Перавага правайдара ў тым, што інтэрнэт добра працуе і ў раённых, і ў абласных цэнтрах.

Калі гэтай хуткасці недастаткова, можна звярнуцца да «Дзелавой сеткі» ці «Шпаркага дамавіка». За доступ да інтэрнэту на хуткасці 1024 Кб/с яны просяць 60 тысяч рублёў. Праўда, першы правайдар працуе толькі ў 16 населеных пунктах, а другі ўвогуле абмяжоўваецца абласнымі цэнтрамі.

А для мінчан існуе яшчэ адна цікавая прапанова: «лайт» ад Мінскіх тэлевізійных інфармацыйных сетак — 22 200 рублёў за досыць марудную (128 Кб/с) працу інтэрнэту.

### Расія

У краіне, якую, як вядома, не памераць агульным аршынам, інтэрнэт таксама не падвядзеш пад агульны назоўнік. Што датычна Масквы, то тут працягвае пераможнае шэсце гандлёвая марка «Стрым». Год таму мінімальны штомесячны плацёж складаў 35 тысяч беларускіх рублёў за інтэрнэт з хуткасцю 2560/512 Кб/с (уваходны/зыходны трафік). Гэтая прапанова падаражала да 38 тысяч рублёў, але з'явілася новая — удвая маруднейшы інтэрнэт, але ўсяго за 20 500 рублёў.

### Украіна

Мясцовы калега «Белтэлекама», кампанія «Укртэлекам» знаходзіцца пад кантролем дзяржавы. Яго інтэрнэт-брэнд «Ого!» працуе ўжо не першы год і паступова зніжае цэны. Летась безлімітны інтэрнэт каштаваў 20 000 рублёў у месяц з невялікай хуткасцю (256/128 Кб/с). Цяпер жа — 18 100 з фантастычнай хуткасцю аддачы інфармацыі (512/3072 Кб/с). Але нават пры такіх умовах існуюць альтэрнатыўныя выгадныя прапановы. У Кіеве дзяржаўную кампанію апярэджвае кампанія «Воля». За 15 тысяч рублёў яна надае інтэрнэт на хуткасці 512 Кб/с.

### Латвія

Нашыя заходнія суседзі жывуць зусім іншымі хуткасцямі. Што да Латвіі, то тут Lattelecom просіць штомесяц 40 тысяч рублёў за 2048/512 Кб/с. Яшчэ год таму гэта каштавала 65 тысяч рублёў. Пры гэтым тэлефонныя званкі па тэрыторыі краіны будуць абсалютна бясплатнымі. Калі ж даплаціць яшчэ трошкі, то можна атрымаць проста фантастычную хуткасць закачкі — да 20 Мб/с, з гарантаваным мінімумам 10 Мб/с.

### Польшча

І толькі польскі інтэрнэт не таннее. За падключэнне да Neostrada кампанія Telekomunikacja Polska просіць усё тыя ж 57 000 рублёў, што і летась. Хуткасць падключэння складае 2 Мб/с.

### Літва

Для поўнай карціны не хапае толькі літоўцаў. І яны таксама не нарадуюцца свайму інтэрнэту ад кампаніі SkyNet. За 40 700 рублёў яны атрымліваюць хуткасць 6 Мб/с, а на ўнутрылітоўскі трафік — усе 100 Мб/с.

### Эстонія

Дарэчы, лідарам у рэгіёне з'яўляецца менавіта гэтая краіна. Там інтэрнэтызацыя краіны рэалізоўвалася як дзяржаўная праграма. У выніку за 26 тысяч рублёў эстонцы атрымліваюць хуткасць 100 Мб/с. Калі падключыцца зараз, то да новага года не трэба плаціць увогуле нічога, напісана на сайце правайдара Elion.

Як відаць, Беларусь застаецца на апошнім месцы сярод бліжэйшых краін па суадносінах цана/хуткасць. Хоць наш інтэрнэт і не самы дарагі — палякі плацяць трохі больш, — але прапускная здольнасць канала пакідае жадаць лепшага.

**Яўген Васількоў**

**Народная ініцыятыва**

Паслуга «Закачка звестак з інтэрнэту» ў Мінску каштуе па прыватных абвестках каля 300 рублёў за гігабайт.

**Самы дарагі беларускі інтэрнэт**

2,24 мільёна рублёў ($750!) каштуе інтэрнэт ад «Сола» на хуткасці 2 Мб/с.

# Калі ў Беларусь прыйдуць бюджэтныя авіякампаніі?

Еўропа і ЗША даўно карыстаюцца таннымі авіякампаніямі, дый для Расіі гэта ўжо не навінка. Там не кормяць на борце, няма камфорту, але і цэны ніжэйшыя на сотні еўра.

Многія беларусы лятаюць таннымі авіялініямі з суседніх дзяржаваў. Дабіраюцца да Рыгі, Кіева, Варшавы ці Масквы, а адтуль ужо лятуць. Усё адно выходзіць нашмат танней, чым з Мінска. Рэйсы ж «Белавія» дазволіць сабе далёка не любы беларус. Напрыклад, таннейшы білет туды-назад да Вены ў «Белавія» каштуе 305 еўра. А з Рыгі туды можна даляцець за 15!

### Чаму так танна?

На бюджэтным авіярэйсе ашчаджаюць на ўсім. Маеш чамадан? Плаці. Хочаш кавы? Купляй. Але цана ўсё адно нават не наблізіцца да кошту «звычайнага» рэйса.

Эканомяць нават на касірах: білеты прадаюцца праз інтэрнэт, а пасажыр сам раздрукоўвае іх.

Аэрапорты, у якія прылятаюць самалёты танных авіякампаній, — не асноўныя. Стуль даражэй дабірацца да горада. У гэтых аэрапортах няма шыкоўных залаў чакання, сістэмы Duty Free, не будзе аўтобуса, які забірае пасажыраў ля трапа.

Вылеты і прылёты часцей за ўсе адбываюцца ці раніцай, ці позна ўвечары — калі паветраны рух не інтэнсіўны.

Усё гэта дазваляе бюджэтным авіякампаніям заставацца прыбытковымі.

### А як жа мы?

«Як вам здаецца, ці магчыма з'яўленне ў Беларусі сваёй бюджэтнай авіякампаніі?» — спыталі мы ў намесніка генеральнага дырэктара па маркетынгу кампаніі «Белавія» Ігара Чаргінца.

«У Беларусі няма ўмоваў, — кажа ён. — Бюджэтныя авіялініі выкарыстоўваюць не асноўныя аэрапорты. А ў нас такіх аэрапортаў няма — «Мінск-1» і «Мінск-2» аднаго ўзроўню».

**«НН»: Але ж ва Украіне і Расіі такія бюджэтныя кампаніі ёсць…**

**ІЧ:** Скажам так: гэта авіякампаніі з элементамі бюджэтнасці. Яны эканомяць на ежы, на багажы, які даводзіцца аплачваць дадаткова, але ў астатнім — гэта тыя ж звычайныя кампаніі. А Ryanair — найбуйнейшая бюджэтная кампанія свету — у Расію яшчэ не прыйшла.

**Юрась Ускоў**



## Сапраўдная беларуская кухня

# Сезон гарбузоў

### Гарбуз з рыбай, свінінай, птушкай

300 г мякаці гарбуза, 300 г нятлустай свініны (філе рыбы, птушкі), алей, соль, прыправы, маянэз, цвёрды сыр да смаку.

Мякаць гарбуза, ачышчаную ад скуркі і семак, нарэзаць скрылікамі. Мяса ці рыбу нарэзаць невялікімі кавалкамі. Мяса трэба адбіць. Раскласці іх, чаргуючы, на блясе, змочанай алеем. Пасыпаць соллю і прыправамі, змазаць зверху маянэзам, пасыпаць цёртым сырам і запякаць у гарачай духоўцы да размякчэння мяса і з'яўлення на страве румянай скарынкі. Падаваць гарачым.

Набор прыпраў можна падабраць да густу. У яго могуць уваходзіць чорны ці чырвоны перац, зіра, семя кунжуту, семя чорнага кунжуту, молаты імберац.

### Гарбуз фаршаваны, для свята

1 гарбуз з тоўстай скурай, фарш як для галубцоў, соль, прыправы да смаку. Соус да смаку.

Калі вы маеце гарбуз невялікіх памераў з тоўстай скурай, можна зрабіць эфектную страву для святочнага стала.

Зрэзаць верхавіну гарбуза, дастаць сярэдзіну з семкамі. Напоўніць гарбуз фаршам, прыгатаваным як для галубцоў (сечанае мяса, адвараны рыс, здробненая цыбуля, яйка, соль, прыправы).

Запячы ў гарачай духоўцы да гатоўнасці.

Падаўшы гарбуз на стол, зняць «крышку», перамяшаць фарш з запечанай мякаццю гарбуза і раскласці па порцыях. Да стравы можна падаць смятану, маянэз ці іншы соус да смаку.

**НБ**

# Кемікі



1) У адной сям'і ёсць дзеці. Адно з дзяцей кажа, што ў яго ёсць брат і сястра. Другое дадае, што ў яго няма брата. Колькі дзяцей ў сям'і?

2) Стаіць дзве каробкі алоўкаў па 10 у кожнай каробцы. Мама дала дзецям з адной каробкі некалькі алоўкаў, а з другой — столькі, колькі засталося ў першай. Колькі алоўкаў дала мама дзецям?

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**

**Адказы глядзі на старонцы 16.**


## Прыватныя абвесткі

**АНТЫКВАРЫЯТ**

**Прадаю адрэстаўраваны прас** на вуголлі. Для працы ды інтэр'еру. Т.: (033) 634–32–01.

**ЖЫТЛО**

**Валька і Міхась здымуць** кватэру. Т.: (029) 690–92–56.

**Мяняю 1-пакаёвую кватэру** (17/30 кв.м, 4 паверх) у цэнтры Віцебска на любое жытло ў Мінску, можна непрыватызаванае. Т.: (029) 947–62–63.

**ЗАНЯТКІ**

**Запрашаю на заняткі дзяцей, падлеткаў, моладзь.** У праграме: мастацкае выплятанне з саломы, маляваныя дываны, папераластыка (выцінанка, бібулкарства), маляванне на шкле, тэкстыльны дызайн (праца з лямцам, тканне пасаў) і яшчэ шмат–шмат чаго цікавага. Заняткі бясплатныя, у Доме творчасці моладзі. Т.: (029) 312–54–71. Валянціна Лойка.

**КАНТАКТЫ**

**Шукаю тых, хто цікавіцца Партугаліяй**, Бразіліяй, Анголай, Мазамбікам, іншымі партугаламоўнымі краінамі. Т.: 267–80–52, (029) 702–03–23.

**КНІГІ, МУЗЫКА**

**Выйшла кніга «страдацельных» песень «Жорсткі раманс»** (недаследаваны жанр у беларускай фалькларыстыцы). 435 старонак. Ахвотным набыць: (029) 672–03–75.

**Прадам нядорага метадычную літаратуру** для настаўнікаў беларускай мовы. Т: (029) 276–15–98.

**Дыск «Начная чытанка радыё «Свабода»** 2007 г. прадам. Т.: (029) 332–69–56, Святлана.

**Старыя часопісы** ARCHE, Partisan, «Тэксты» прадам. Т. (029) 332–69–56, Святлана.

**Прадаю Біблію** за 5000 рублёў. Т.: (0212) 25–80–79.

**ПАДАРОЖЖА**

**Шукаю аднадумцаў для вандроўкі** 31 кастрычніка па маршруце Мінск—Гродна—Мінск: Т.: 262–73–43, (029) 111–73–32.

**ПРАЦА**

**Беларускамоўная дзяўчына шукае** беларускамоўную працу! Пра сябе: вышэйшая лінгвістычная адукацыя (нямецкая, англійская, троху французская і польская), досвед працы 3 гады ў якасці перакладчыка і сакратара. Т.: (029) 778–68–36. Зацікаўленым дашлю рэзюмэ.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e–mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!




PHOTO BYMEDIA.NET

**12 кастрычніка стаў чарговым святочным днём для беларускага футбола. Моладзевая зборная абыграла італьянцаў і выйшла ў фінальную частку чэмпіянату Еўропы. А дарослая зборная перамагла Албанію 2:0. На фота — Сяргей Крывец. Некалькіх хвілін, на якія яго выпусцілі на поле, яму хапіла, каб забіць.**



**У Гомелі МАЗ, з пяском зляцеў у возера. Кіроўца чакаў ратавальнікаў у кузаве.**



**Завершылася эпапея чылійскіх гарнякоў, якія з жніўня чакалі паратунку на глыбіні 700 метраў. Апошнім пакінуў шахту іхны брыгадзір Луіс Урсуа. На фота побач з ім — шчаслівы прэзідэнт Чылі.**



**Ад 14 кастрычніка самым маленькім чалавекам планеты лічыцца 18-гадовы жыхар Непала Хагендра Тапа Магар. Яго рост — 66 см, а важыць ён 6,5 кг.**




**Слуцкі ЗАГС зарэгістраваў новую сям'ю. Случчанка выйшла замуж за грамадзяніна Нігерыі. Франк і Ірына Оруе пазнаёміліся ў Маскве. Жаніх, нявеста і ўсе госці прыехалі на двух лімузінах. Незвычайнасць сітуацыі была ў тым, што рытуал рэгістрацыі быў праведзены па індывідуальным сцэнары «Беларускае вяселле», цалкам у нацыянальным стылі.**




## Анекдоты

* * *

Муж сядзіць за кампутарам і гуляе ў «стралялку». Жонка, спрабуючы прыцягнуць увагу мужа:
— Ну вось скажы мне, навошта табе гэтыя монстры, калі ў цябе ёсць я?

* * *

Даярку з калгаса выгнаць можна, калгас з даяркі — не!

* * *

Пасляхова скончыўся палёт першых падземных чылійскіх касманаўтаў.

* * *

— Мая жонка як зацыруе штаны — дык зусім не заўважна...
— А мая як памые кашулю — таксама не відаць.

* * *

— Хадзіць ён пачаў рана. У чатыры ён чытаў. У пяць — дэкламаваў вершы. А ў шэсць ужо на ўсю моц іграў на фартэпіяна ...
— Якое ў вас здольнае дзіця!
— Ды гэта я пра мужа распавядаю... як ён нам у выходныя раніцай спаць не дае!

* * *

Вядомы ілюзіяніст Дэвід Каперфільд прайшоў скрозь крамлёўскую сцяну. У сцяне яго сустракалі: таварыш Грамыка, таварыш Суслаў і іншыя афіцыйныя асобы.

## «НН» сто гадоў з вамі

**Вільня.** Грамадка асоб, што жывяцца варывам ды штучнымі харчамі, а мяса не ядуць, злажыла першую ў гэтым краі бескрывавую харчэўню. Нямашака ў ёй да пажыўку ніякага мяса — ні кроплі крыві загубленых жывёлаў. Ежа будзе давацца пажыўная, здаровая, смачная і танна. Для забавы будуць шашкі і да чытання газеты.

**«НН». № 41. 1910.**

**У сталіцы** па стане на 18 гадзін да скрынак прыйшло 38,8% выбарцаў, а на 20 гадзінаў звестак не было. Напэўна, Цэнтрвыбаркам вагаўся, паставіць 51 ці 52%.

Затое ў Быхаўскім раёне, як паведамілі ў Цэнтральнай каардынацыйнай радзе для назірання за выбарамі, зафіксавана рэкордная з'яўленне выбарцаў — 99,4%!

Апазіцыя заяўляе, што рэальна да скрынак прыйшло 45%, у гарадах з насельніцтвам ад 50 000 чалавек — крыху болей за 35%.

Улады святкуюць перамогу сваіх кандыдатаў.

Выглядае, што і байкот удаўся, і палату прызначылі.

**«НН». № 42. 2000.**

**Адказы да старонкі 15:**

1) Трое — дзве дзяўчынкі і 1 хлопчык; 2) 10.

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6410.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 19.10.2010.
Замова № 5101.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
ISSN 1819-1614
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12